ЯК ЖЫВУЦЬ БЕЛАРУСКІЯ АРХІВЫ 12

ФРАНТАВЫЯ СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ ФІЛАРМОНІІ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 КРАСАВІКА 2022 г. АЎТОРАК № 80 (29702)

КАРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў вядомага савецкага хакеіста Уладзіслава Трацяка з 70-годдзем.**
- У беларускае войска гэтай вясной адправяць каля 10 тысяч прызыўнікоў.
- **Эксперыментальную дарожную разметку «Трамвай» нанясуць у Мінску.**
- Беларусь прапануе Узбекістану пабудаваць сумеснае прадпрыемства па перапрацоўцы крыві.
- **Форум БРСМ па інфармацыйнай бяспецы пройдзе ў Мінску 28 красавіка.**
- Апеляцыйны эканамічны суд плануецца стварыць у Беларусі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Важнасць IT для эканомікі бясспрэчная, сектар прыносіць значную экспартную выручку, і дадзеную тэндэнцыю неабходна захаваць. Неабходна развіваць і ўдасканальваць існуючую мадэль, найлепшыя практыкі і кампетэнцыі, напрацаваныя ў ПВТ. Але, акрамя таго, трэба ўзмацняць і прасоўваць новыя напрамкі, звязаныя з лічбавізацыяй нацыянальнай эканомікі. Нашы партнёры ставяць задачы распрацоўкі і ўкаранення ўласнага праграмнага забеспячэння замест заходніх аналагаў. Гэтыя нішы і магчымасці нельга выпускаць. Прапрацоўваецца пытанне аб неабходнасці запуску праграмы імпартазамяшчэння праграмнага забеспячэння. Дэталёва вывучаецца запатрабаванне ў ім у галінах і на прадпрыемствах».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ШЧАСЦЕ, ПА ВЯЛІКІМ РАХУНКУ, У НАС АДНО — ЗБЕРАГЧЫ НАШУ ЗЯМЛЮ»

Прэзідэнт на Вялікдзень папрасіў беларусаў берагчы родную зямлю. З такім пасылам Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да вернікаў у храме Праабражэння Гасподняга ў гарадскім пасёлку Копысь Віцебскай вобласці.

Фота БелТА.

«Беларусам я хачу сказаць адно: шчасце, па вялікім рахунку, у нас адно — трэба зберагчы нашу зямлю. У гэтым храме я звяртаюся да сваіх суайчыннікаў, беларусаў, і хачу папрасіць іх, запатрабаваць як Прэзідэнт: беражыце Беларусь! Страціце сваю зямлю — не будзе ў вас ні здароўя, ні шчасця, ні грошай, ні солі, ні дзяцей вашых», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, можа, не ўсе гэта разумеюць цяпер, бо важнасць такіх рэчаў становіцца відавочнай, толькі калі іх страціш. «Вялікая гэта справа — берагчы Беларусь. Мы разумеем, калі губляем нешта ў сваёй хаце, а гэта наш вялікі дом. Запомніце: не будзе гэтага вялікага дому — не будзе і вашага малога дому. А калі мы станем на калені, дык і нашых праваслаўных храмаў не будзе, як было заўсёды ў гісторыі нашай краіны», — працягнуў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт заўважыў, што Вялікдзень — самае добрае і жаданае свята для вернікаў. «Так было заўсёды. І гэтае свята заўсёды людзям дарыла надзею. Надзею на справядлівасць і шчасце. Надзея ў нашых сэрцах жыве і дагэтуль. У кожным чалавеку, не толькі ў беларусаў. Як у народзе кажуць: надзеяй жывы не будзеш. Але без надзеі, сапраўды, шчасця не ўбачыш», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, гэтае вялікае светлае свята магчыма параўнаць толькі са свецкім святам Перамогі. «Гэта раўназначна, а Уладыка мне казаў, што без Бога і Перамогі не было б. Гэтыя два святы заўсёды ў душы, у сэрцы нашага чалавека», — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

Ён падкрэсліў, што адзначаць Вялікдзень прынята ў коле родных і блізкіх сяброў. «Вось і прычына, чаму я прыехаў сёння на гэтую святую, родную зямлю, дзе некалі нарадзіўся. Шмат разоў цікава было, і мы з хлапчукамі прыходзілі ў храм, які стаяў у гэтым месцы, і глядзелі на нашых маці, якія прыходзілі сюды, каб сустрэць гэта светлае свята», — успомніў Прэзідэнт.

Ён мяркуе, што ў гэты дзень у Бога, як заўсёды, просім галоўнага — міру, згоды, сяброўства, якія заўсёды былі ўласцівыя беларускаму чалавеку.

СТАР. 2

Актуальна

ХТО ПАВІНЕН ЗАПЛАЦІЦЬ ЗА КВАТЭРУ ПА ВЫНІКАХ ГОДА?

Прапануем усе нюансы аплаты маёмасных падаткаў

У канцы мінулага года кіраўнік дзяржавы падпісаў Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання». Як адзначаюць многія спецыялісты, карэкціроўка Падатковага кодэкса на 2022 год нацэлена вырашыць практычныя пытанні падаткаабкладання. А мы дэталёва разбяромся, каго менавіта закранулі гэтыя змены. На пытанні нашага карэспандэнта пагадзіўся адказаць намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Ігар СКРЫННІКАЎ.

СТАР. 4

Важныя рэчы

ДРЭННЫ ХАРАКТАР ЦІ ХВАРОБА?

Спецыялісты — пра асаблівасці псіхікі пажылых

Нярэдка ў пажылым узросце да фізічных хвароб дадаюцца і псіхічныя расстройствы. Больш за тое, лішняя вага, артэрыяльны ціск, цукровы дыябет, якія характэрныя для многіх людзей сталага веку, ім садзейнічаюць. Гэтак жа як і пандэмія COVID-19 з самаізаляцыяй, пазбаўленнем ад звыклых кантактаў і адзінотай.

Самымі распаўсюджанымі псіхічнымі праблемамі пажылых людзей спецыялісты называюць дэпрэсію і дэменцыю. І калі другую вылечыць нельга, то першую — проста неабходна. Як западозрыць у сябе ці блізкага дэпрэсію? Чаму не трэба баяцца антыдэпрэсантаў? Ці можна пазбегнуць дэменцыі і як правільна займацца яе прафілактыкай? Якой павінна быць падтрымка чалавека з дэменцыяй і як правільна яго даглядаць? Пра гэта і іншае расказалі спецыялісты.

Застацца пры розуме

Аб праблемах дэменцыі расказала **кіраўнік Рэспубліканскага геранталагічнага цэнтра (актыўнага даўгалецця), галоўны герыятр Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** Яна адзначыла, што асабліва актуальным гэтае расстройства стала ў апошнія гады і дзесяцігоддзі. Расце працягласць жыцця ў многіх краінах свету, і Беларусь — не выключэнне.

СТАР. 7

«ШЧАСЦЕ, ПА ВЯЛІКІМ РАХУНКУ, У НАС АДНО — ЗБЕРАГЧЫ НАШУ ЗЯМЛЮ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён заявіў, што, знаходзячыся ў храме, хацеў бы звярнуцца не толькі да беларусаў, але перш да нашых суседзяў. «Давайце берагчы мір. Гэта зараз так актуальна. Жартавалі з мяне, асабліва так званая апазіцыя: «Чаго ён там увесь час — «толькі б не было вайны». А я заўсёды казаў: калі вайна, дык нічога не трэба. І як актуальна сёння гучаць гэтыя патрабаванні беларускага народа: абы не было вайны. Таму ў імя міру і нармальнага жыцця, і сяброўства я жадаў бы звярнуцца да нашых суседзяў: давайце жыць дружна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Фота БелТА.

Ён таксама папрасіў сваіх калег-палітыкаў не ствараць людзям праблем, якіх і так зараз хапае. «Паглядзіце, што адбываецца з суседнімі Літвой і Латвіяй, палякамі. Я пра Украіну ў дадзеным выпадку ўжо і не кажу. Яны былі такія шчаслівыя, вясёлыя, жылі ў такім заможным свеце. У іх было ўсё, у нас нічога не было. І дзе яны сёння? Яны стаяць уздоўж граніцы і просяць нас, каб мы іх прапусцілі ў Беларусь, далі хоць бы грэчкі і солі купіць. Мы, як высакародныя людзі, адкрываем гэтую граніцу, заўсёды шанавалі гэтых ахвярадаўцаў. На жаль, не так шмат у нас людзей, якія ўмеюць ахвяраваць не тое што сабой, а сваім. Але іх з'яўляецца ўсё больш. Калі мы будзем шанаваць гэтых людзей, іх будзе шмат, прынамсі, дастаткова. Такая філасофія жыцця», — разважаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падзякаваў святарам за тое, што яны жывуць дзеля людзей, ахвяруюць дзеля іх сваім часам.

«Будзьце заўсёды са сваім народам. Няма ў свеце больш адданых святароў, чым у Беларусі. І больш асабліва напярэдадні рэлігійных свят — Вялікадня каталіцкага ці праваслаўнага», — заявіў кіраўнік краіны.

Паводле яго слоў, граніца не павінна перашкаджаць нармальнаму жыццю. «Мы па-суседску заўсёды ставіліся да людзей, па-чалавечы, па-людску, як у нас гавораць. Мы адзінага хочам, каб такое ж было ў дачыненні і да нас», — канстатаваў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка краіны, прыклад Ісуса, які ахвяраваў сабой у імя чалавека, у імя людзей, — гэта вялікая школа для кожнага. «Па-першае, мы павінны навучыцца ахвяраваць у імя галоўнага — людзей. Я вас папрасіў бы, каб вы сумленных больш нідзе няма. Так, святары розныя, як і мы, — яны ж ад нашага грамадства. Але самыя адданыя, сумленныя і надзейныя ў нас. У нас яшчэ засталося нешта светлае, незамутненае, што засталася ў спадчыну ад нашых продкаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Па традыцыі Прэзідэнт падараваў храму ікону (гэтым разам з выявай Божай Маці), а **архіепіскапу Віцебскаму і Аршанскаму ДЗІМІТРЫЮ,** які вітаў яго ў храме, — букет белых ружаў. Вернікі ў адказ прэзентавалі адзін з сімвалаў свята — яйка, зробленае са шкла.

«Мы ідзём па гэтым шляху, як воіны Хрыстовы, каб мы маглі гэтым злым рэчам, войнам, што здзяйсняюцца, супрацьстаяць. Супрацьстаяць духам Божым. А для гэтага неабходна сябе ўзмацняць, цвёрдасць мець», — пажадаў архіепіскап вернікам і Прэзідэнту.

Храм, які наведаў кіраўнік краіны, — выбітны узор рускага драўлянага дойлідства XVII стагоддзя. Драўляны двухкупальны храм пацярпеў ад пажару ў пачатку XX стагоддзя. Праз час яго адбудавалі нанова. Мінула яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў, і адноўленая царква зноў адчыніла дзверы для вернікаў у 2018 годзе. Да гэтага з просьбай аб будаўніцтве храма звярнуліся да Прэзідэнта мясцовыя жыхары. Аднаўленне царквы стала магчымым дзякуючы ахвяраванням мецэнатаў. Спонсарамі выступілі больш за дзесяць арганізацый і справіліся з задачай менш чым за год. Храм напоўнілі ранейшым убраннем — абразамі XVIII—XIX стагоддзяў і напісалі новы іканастас. Асаблівая рэліквія — Іверская ікона Божай Маці, напісаная на кафельнай дошцы.

Марыя ДАДАЛКА,
г. п. Копысь.

Парламенцкі дзённік

«МЫ БУДЗЕМ УЗАЕМАДЗЕЙНІЧАЦЬ НА КАРЫСЦЬ НАШЫХ КРАІН І НАРОДАЎ»

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расіі ў Беларусі Барысам ГРЫЗЛОВЫМ

Кіраўніка расійскай дыпмісіі ў Мінску спікер верхняй палаты парламента назвала добрым сябрам Беларусі і выказала ўпэўненасць, што супрацоўніцтва краін з яго прыходам на пасаду працягнецца канструктыўна. «Казаць аб тым, што адносіны паміж нашымі краінамі стратэгічныя, няма неабходнасці, таму што гэта сапраўды так. Мы добрыя сябры. Мы браты. І ўсе тыя задачы, якія сёння стаяць перад нашымі краінамі, — для нас гэта вельмі важна. Важна наша ўзаемадзеянне», — перадае БелТА словы Наталлі Качанавай.

Спікер падкрэсліла: дыялог паміж нашымі краінамі развіваецца абсалютна па ўсіх напрамках, і гістарычныя традыцыі і карані, якія звязваюць народы, дапамагаюць у гэтым. «Практычна няма закрытых тэм ні для расіян, ні для беларусаў. Таму што мы разам выбудоўваем нашу Саюзную дзяржаву Беларусі і Расіі ў такой добрай інтэграцыі, якая склалася паміж нашымі краінамі, — адзначыла яна. — Выбудоўванне дыялогу на найвышэйшым узроўні, тое ўзаемадзеянне, якое складваецца сёння па рэалізацыі 28 саюзных праграм, надае нам упэўненасці ў тым, што мы будзем узаемадзейнічаць на карысць нашых краін і народаў».

Наталля Качанава адзначыла важнасць узаемадзеяння парламентарыяў дзвюх краін. Так, Савет Федэрацыі і Нацыянальны сход Беларусі шмат гадоў праводзяць Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Сёлета ён пройдзе ў Гродне 23—24 чэрвеня. «Гэта апагей таго, што адбываецца на працягу года, таму што мы працуем шмат. Сустракаюцца нашы губернатары, падпісваюцца кантракты, пагадненні, — канстатавала спікер. — Сёлета запланавана яшчэ адно важнае мерапрыемства па лініі маладзёжнай тэматыкі — «Цягнік Памяці», дзе будуць удзельнічаць школьнікі Беларусі і Расіі, па 100 чалавек ад кожнай краіны. Старт будзе дадзены ў Брэсце. Нашы дзеці наведаюць 14 гарадоў Беларусі і Расіі».

Наталля Качанава расказала, што ў гэтую работу ўключыліся ўсе міністэрствы і ведамствы, каб мерапрыемства прайшло ўдала, і тады можна разлічваць, што яно стане традыцыйным.

Фота БелТА.

Супрацоўніцтва

НІЯКАЙ ФАНТАСТЫКІ — ТОЛЬКІ ЭКАНОМІКА

Урадавая дэлегацыя на чале з прэм'ер-міністрам Беларусі Раманам ГАЛОЎЧАНКАМ наведала Узбекістан. Падчас візіту старшыня Саўміна правёў перагаворы са сваім узбекскім калегам Абдулой АРЫПАВЫМ, прэзідэнтам краіны Шаўкатам МІРЗІЁЕВЫМ і міністрам прамысловасці і гандлю Расіі Дзянісам МАНТУРАВЫМ.

Фота БелТА.

Раман Галоўчанка падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам Узбекістана абазначыў перспектывы супрацоўніцтва краін, паведамляе БелТА. «У нас ёсць прапановы ў галіне пасажырскага гарадскога транспарту. Развіццё электратранспарту сёння не проста даніна модзе, на наш погляд, гэта асноўнае рашэнне, якое будзе вызначаць структуру транспарту ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі. Хацелі б прапанаваць нашы магчымасці ў гэтым экалагічным сектары транспарту», — сказаў Раман Галоўчанка.

У Ташкенце разглядаецца магчымасць аднаўлення трамвайнага руху. Беларускі бок гатовы прадставіць комплексныя рашэнні з неабходнай інфраструктурай, планаваннем і пастаўкай рухомага саставу. «Калі такое рашэнне будзе прынятае, то разгледзім і магчымасць вытворчасці ва Узбекістане», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Беларусь зацікаўлена і ў развіцці вытворчай кааперацыі — гатовы развіваць праекты па выпуску сельскагаспадарчай, спецыяльнай, аварыйна-ратавальнай тэхнікі на базе беларускіх рашэнняў. Многія з гэтых прапаноў, перадавых распрацовак беларускіх машынабудаўнікоў прадстаўлены на міжнароднай выстаўцы «Інапрам. Цэнтральная Азія», што праходзіць у Ташкенце.

Раман Галоўчанка закрануў тэму сельскай гаспадаркі і звярнуў увагу на тое, што Беларусь і Узбекістан маюць моцную аграрную базу і сучасныя тэхналогіі вырошчвання сельгаспрадукцыі. «Мы павінны быць гатовы да неабходнасці павелічэння аб'ёмаў вытворчасці прадуктаў харчавання. У беларускага боку ёсць прапановы па рэалізацыі сумесных праграм з Узбекістанам з выкарыстаннем нашага вопыту і тэхналогій. Гатовы забяспечыць патрэбы ў племянной жывёле, камбікармах, прэміксах, ветэрынарных прэпаратах, стварэнні апорных малочнатаварных комплексаў», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

З прэзідэнтам Узбекістана беларускі прэм'ер абмеркаваў ключавыя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва ў розных галінах, у тым ліку ў сферы эканомікі.

На сустрэчы з міністрам прамысловасці і гандлю Расіі Дзянісам Мантуравым Раман Галоўчанка заявіў аб неабходнасці хутчэй выходзіць на вынік у сферы прамысловасці.

«Нам трэба хутчэй выходзіць на вынік, таму што цяпер час працуе супраць нас. Нам трэба паводзіць сябе не як чыноўнікі, а як добрыя бізнесмены-кіраўнікі», — сказаў Раман Галоўчанка. Ён адзначыў, што на выстаўцы «Інапрам. Цэнтральная Азія» прадстаўлена шырокая беларуская экспазіцыя. Гэта яшчэ адна магчымасць для развіцця двухбаковых кантактаў і актывізацыі супрацоўніцтва ў новых умовах.

Раман Галоўчанка і Абдула Арыпаў наведалі прамзону TEXNOPARK, дзе прэм'ер-міністрам паказалі вытворчасць па выпуску імпартазамяшчальнай прамысловай прадукцыі і бытавой тэхнікі, ліфтаў, эскалатараў і металаканструкцый.

Вынікамі двухдзённага візіту прэм'ер-міністр падзяліўся з журналістамі. «На нашы планы не накладаюць абмежаванняў працэсы, што адбываюцца ў свеце. Сёння і прэзідэнт Узбекістана падкрэсліў, што наша супрацоўніцтва ўстойлівае і доўгачасовае. Цяпер задача — напоўніць яго новым сэнсам. Мэта нашай работы тут — знайсці новыя кропкі прыкладання намаганняў, дзе дзве краіны маглі б атрымаць новы дадатковы кошт», — паведаміў прэм'ер.

Па яго словах, праекты, што ўжо маюць краіны, будуць рэалізоўвацца і далей, а прыбылі яны ў Ташкент, каб зайсці новыя кропкі росту.

«Па экспрэс-выніках работы магу сказаць, што гэтыя кропкі знойдзены, — падагульніў Раман Галоўчанка. — Наша задача — дасягнуць як мінімум паўмільярднага рубяжу гандлю. І гэта рэальна. Тут няма ніякай фантастыкі. Мы здольныя выйсці і на больш высокія аб'ёмы ўзаемнага гандлю і інвестыцый».

На кантролі

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ДАСТУПНАСЦЬ ТАВАРАЎ

Парламентарыі краіны працягваюць маніторынг цэн і асартыменту ў прадуктовых крамах, аптэках. Асаблівая ўвага аддаецца сацыяльна значным таварам і лекам. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны Яўген ЗАЙЦАЎ правёў маніторынг цэн на сацыяльна значную групу тавараў, а таксама асартыменту ў некалькіх гандлёвых аб'ектах Брэста. Парламентарый наведаў крамы ААТ «Прадтавары» і ГК «Алмі».

У краме «Прадтавары».

Першым аб'ектам рэйду стала крама № 5 фірмы «Прадтавары» пад назвай «На балоце». Магазін размешчаны ў мікрараёне Кіеўка, пабудаваны даволі даўно, яшчэ ў тую пару, калі Кіеўка з'яўлялася ўскраінай горада, а цяперашні прыватны сектар толькі змяніў статус былых прыгарадных вёсак. Адсюль і назва — «На балоце». Так яго дзесяцігоддзямі называлі людзі, а потым «народную» назву афіцыйна ўзаконілі. Цяпер гэта адна са шматлікіх крам «Прадтавараў», якая па-сучаснаму абсталявана, карыстаецца папулярнасцю ў мясцовага насельніцтва, дарэчы, адзіная ў абласным цэнтры кругласутачная крама.

Загадчыца гандлёвай кропкі Таццяна Мацюшык сказала, што іх установа знаходзіцца ў выгадным месцы з пункту гледжання наведвальнікаў, побач праходзіць дарога на важнае скрыжаванне — Камянецкае кольца, а каля крамы маецца прасторная стаянка. Таму многія гараджане, асабліва па дарозе на ўік-энд заязджаюць па прадукты. А яшчэ адметнай рысай аўдыторыі пакупнікоў з'яўляецца вялікая колькасць сталага насельніцтва, бо раён немалады.

— Але вялікага ажыятажу, таго, каб закуплялі ў запас, не было, — адзначае Таццяна Канстанцінаўна. — Замест адной упакоўкі солі ці цукру бралі дзве, замест адной бутэлькі алею таксама дзве. А такога, каб куплялі мяшкамі ці скрынямі, не назіралася. Тавару сёння хапае.

Магазін групы кампаній «Алмі» ў параўнанні з папярэднім даволі малады, мае гісторыю адрэзкам у дзесяць гадоў і размешчаны ў адносна маладым мікрараёне Вулька. Крама немалая — 420 квадратных метраў. Паводле слоў кіраўніка гандлёвага аб'екта Людмілы Таміл кі, месяц таму перажылі ажыятажны попыт на некаторыя прадукты харчавання. Цяпер сітуацыя стабілізавалася, і работа ідзе ў звычайным рэжыме.

Дэпутат Яўген Зайцаў, калі разам з памочнікам падрабязна азнаёміўся са змесцівам паліц і вывучыў цэннікі ў магазінах, пракаментаваў сітуацыю так:

— Мы бачым павышэнне цэн на пэўны пералік імпартных тавараў. Але ж варта адзначыць, што для гэтага ёсць аб'ектыўныя прычыны. Напрыклад, лагістыка, якая на сённяшні дзень мае пэўныя цяжкасці і збоі ва ўсім свеце з-за нядобразычлівых дзеянняў Захаду. Усё гэта ў канчатковым выніку можа прывесці да падаражання імпартных тавараў.

Вывучаючы асартымент і наяўнасць тавараў на паліцах, мы супаставілі сакавіцкія цэны да красавіцкіх. Канстатавалі нязначнае падаражанне пэўных відаў тавараў, напрыклад, мукі, яек, цукру. Але ж убачылі, напрыклад, што тушка курыцы, свініна патаннелі ў параўнанні з сакавіком на 1,5-4 працэнты.

Паводле меркавання дэпутата, у цэлым цанавая палітыка на сацыяльна значную групу тавараў вядзецца ў адпаведнасці з пастановай Саўміна № 214 ад 7 красавіка 2022 года «Аб рэгуляванні цэн», асноўная мэта якой — падтрыманне цанавой стабільнасці, супрацьдзеянне спекуляцыйнаму росту цэн і магчымаму дэфіцыту асобнай катэгорыі тавараў.

У працэсе маніторынгу браліся за аснову тыя віды тавараў, якія вызначаны ўказанай пастановай як сацыяльна значныя. Галоўнае, што неабгрунтаванага павышэння цэн у аб'ектах гандлёвай сеткі не было выяўлена. Нязначнае падаражанне тавараў айчынных вытворцаў выклікана павышэннем сабекошту тавараў. Адзначана, што ў гандлёвых залах маецца дастатковы асартымент прадукцыі як айчыннай, так і замежнай вытворчасці. На паліцах прадстаўлены тавары ад розных вытворцаў. Выбар тавараў даволі вялікі, дэфіцыту на нейкі від прадукцыі не было адзначана, умовы захоўвання здавальняючыя. «Галоўнае цяпер — не дапусціць неабгрунтаванага павышэння цэн і забяспечыць даступнасць тавараў для спажыўца», — падкрэсліў Яўген Станіслававіч.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Рэгіёны

УТУЛЬНАЯ ПРАСТОРА ДЛЯ ВАРТАВЫХ ДАРОГ

Камфортныя ўмовы для здачы экзамену, атрымання і абмену вадзіцельскіх пасведчанняў, а таксама нясення кругласутачнай службы стварылі ва ЎДАІ ЎУС Гомельскага аблвыканкама. У Дзяржаўтаінспекцыі рэгіёна пачало працаваць адноўленае памяшканне міжраённага экзаменацыйнага аддзела і мадэрнізаваная дзяжурная часць.

Фота ЎУС Гомельскага аблвыканкама.

Памяшканню міжраённага экзаменацыйнага аддзела ДАІ вобласці сёлета 40 гадоў, і гэта першы сур'ёзны рамонт з моманту яго адкрыцця. Цяпер здаваць экзамены і атрымліваць вадзіцельскае пасведчанне будзе нашмат больш камфортна: у адным крыле размешчаны экзаменацыйны клас, інфакіёск, фотакабінет, абсталявана ўтульная зала для чакання. У абноўленым камп'ютарным класе — зручная мэбля і сучасная тэхніка: здаваць экзамены тут могуць адначасова 24 чалавекі. Раней экзаменацыйныя групы прыходзілася дзяліць, што падаўжала час праходжання экзаменаў.

У цырымоніі адкрыцця адноўленага памяшкання міжраённага экзаменацыйнага аддзела прыняў удзел **начальнік ЎУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ШАСТАЙЛА.** Кіраўнік ведамства ў рэгіёне выказаў спадзяванне, што ў такіх камфортных умовах усе патэнцыяльныя кіроўцы, хто прыходзіць на іспыты, вытрымаюць іх з першага разу.

— Штодня ДАІ па розных пытаннях наведвае 200—300 чалавек, і хочацца, каб наведвальнікам было камфортна. Таму мы будзем і далей працягваць работу ў гэтым кірунку, — паабяцаў Аляксандр Шастайла. — У планах на гэты год — адрамантаваць спецыяльную пляцоўку для здачы экзаменаў па ваджэнні. Будуць выдзелены сродкі з абласнога бюджэту на мадэрнізацыю фасада будынка абласной Дзяржаўтаінспекцыі.

У планах — перанесці на першы паверх і мадэрнізаваць рэгістрацыйнае падраздзяленне, каб зрабіць работу гэтай службы больш даступнай для маламабільных грамадзян. У найкарацейшыя тэрміны ЎДАІ плануюць таксама набыць службовы аўтамабіль з аўтаматычнай каробкай перадач для здачы экзаменаў.

Між тым не менш важным сёння застаецца стварэнне максімальна тэхналагічнай і камфортнай прасторы для нясення кругласутачнай службы супрацоўнікаў ДАІ. На гэта звярнуў увагу начальнік ЎУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Шастайла падчас адкрыцця мадэрнізаванага аддзела аператыўна-дзяжурнай службы ЎДАІ. Прастора службовага памяшкання максімальна прадуманая: праведзены сучасны рамонт, устаўляваныя найноўшыя камп'ютары і маніторы, на якія выведзена гарадская сістэма відэаназірання. Так, супрацоўнікі ў анлайн-рэжыме могуць адсочваць дарожную абстаноўку ў Гомелі і тэрмінова рэагаваць сіламі нарадаў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Макрон хоча бачыць жанчыну на пасадзе прэм'ер-міністра

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон, які напярэдадні быў абраны на другі тэрмін, хацеў бы бачыць жанчыну ў якасці новага старшыні ўрада. Аб гэтым заявіў дзяржсакратар пры МЗС Францыі Клеман Бон, перадае тэлеканал BFMTV.

«Макрон, вядома, хацеў бы прызначыць жанчыну ў Маціньёнскі палац» (рэзідэнцыя прэм'ер-міністра Францыі. — Рэд.), — запэўніў Бон. Пры гэтым ён заклікаў не зводзіць усю палітычную сітуацыю пасля перавыбрання Макрона толькі да фігуры прэм'ера.

Паводле інфармацыі тэлеканала, сярод магчымых кандыдатур на пасаду старшыні ўрада фігуруе міністр працы Элізабет Борн. Цяперашні прэм'ер Францыі Жан Кастэкс, які займае дадзеную пасаду з ліпеня 2020 года, заявіў, што ў найбліжэйшыя дні пасля выбараў, у адпаведнасці з традыцыяй, падасць прашэнне аб адстаўцы.

Раней стала вядома аб публікацыі ў Францыі канчатковых вынікаў выбараў прэзідэнта. Макрон перамог, набраўшы 58,55 % галасоў, а кандыдат ад «Нацыянальнага аб'яднання» Марын Ле Пен набрала 41,45 %.

Назарбаеву прысвояць у Канстытуцыі статус «заснавальніка незалежнага Казахстана»

Рабочая група, якая займаецца папраўкамі ў Канстытуцыю Казахстана, разглядае магчымасць прысвоіць першаму прэзідэнту краіны Нурсултану Назарбаеву статус «заснавальніка незалежнага Казахстана». Пра гэта паведамляе партал NUR.

«Першы Прэзідэнт Рэспублікі Казахстана — гэта заснавальнік незалежнага Казахстана, гэта значыць такі статус будзе вызначаны. Я думаю, гэты статус будзе мець вялікае значэнне, таму што тыя заслугі, той аб'ектыўны факт, які ёсць, будзе замацаваны ў Канстытуцыі», — сказаў член рабочай групы Ярмек Абдрасулаў.

Нурсултан Назарбаеў, які склаў паўнамоцтвы прэзідэнта ў сакавіку 2019 года, займаў пасаду кіраўніка дзяржавы з 1991 года. Пры гэтым палітык надзелены статусам лідара нацыі (дзейнічае асобны адпаведны закон) і застаецца членам Канстытуцыйнага савета Казахстана.

Памерла найстарэйшая жанчына ў свеце

У Японіі ва ўзросце 119 гадоў памерла найстарэйшая жанчына ў свеце, паведаміў тэлеканал NHK.

Японка Канэ Танака нарадзілася 2 студзеня 1903 года. Яе муж і старэйшы сын загінулі падчас Другой сусветнай вайны. З 2005 года яна жыла ў доме састарэлых у горадзе Фукуока. Канэ заўсёды рана ўставала, любіла есці шакалад і піць газіраваныя напоі, а таксама гуляць у рэверсі і іншыя настольныя гульні. У яе была мара: яна хацела дажыць да 120 гадоў.

Губернатар прэфектуры Фукуока Хаторы сказаў, што быў засмучаны, калі даведаўся аб смерці Канэ Танака. Ён прынёс спачуванні ўсім родным і блізкім.

Надвор'е

ПАЦЯПЛЕЕ, АЛЕ МЕСЦАМІ ТАКСАМА ДАЖДЖЫ

А ў чацвер і пятніцу прагназуюцца замаразкі да мінус 3-4 градусаў

Дажджлівым аказаўся сёлетні красавік, да таго ж яшчэ і халодным. Па даных на 25 красавіка, за мінулы перыяд месяца на большай частцы краіны выпала ад 1 да 2 месячных нормаў ападкаў, а па паўднёвым усходзе краіны месцамі — звыш 3 красавіцкіх нормаў. Наступны тыдзень абяцае быць менш дажджлівым, аднак...

У першай палове тыдня асноўная зона дажджоў будзе знаходзіцца ў паўднёвых і паўднёва-ўсходніх рэгіёнах краіны, дзе-нідзе могуць прагрымець навальніцы, на астатняй тэрыторыі кароткачасовыя дажджы будуць праходзіць месцамі, а ў асобныя дні пад уплывам зоны павышанага атмасфернага ціску ападкаў па краіне не прагназуецца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У другі дзень тыдня будзе воблачна з прасяненнямі. Так, у аўторак месцамі, а па поўдні ў многіх раёнах пройдуць дажджы, удзень у асобных рэгіёнах чакаюцца навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі магчымы слабы туман. Вецер паўночны, паўночна-заходні 4—9 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Максімальная тэмпература паветра — ад плюс 10 градусаў да 16 цяпла.

Мокра будзе і ў сераду. У гэты дзень месцамі па краіне, а ўначы па паўднёвым усходзе на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ноччу будзе ад нуля да 6 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 8 градусаў. Удзень — ад плюс 7 градусаў па поўначы да 15 цяпла па поўдні краіны.

У наступныя два дні начное неба будзе чыстым, таму чакаюцца замаразкі. Непасрэдна ў чацвер будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра складзе ўначы ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, удзень — 8—14 градусаў вышэй за нуль.

Сяргей КУРКАЧ.

ХТО ПАВІНЕН ЗАПЛАЦІЦЬ ЗА КВАТЭРУ ПА ВЫНІКАХ ГОДА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ігар Віктаравіч, якія змены сёлета закранулі падаткаабкладанне маёмасці фізічных асоб і чаму?

— Так, з 2022 года сапраўды адбыўся шэраг істотных змяненняў у падаткаабкладанні нерухомай маёмасці грамадзян.

У першую чаргу, варта адзначыць адмену льготы па падатку на нерухомасць у дачыненні да адной кватэры. Гэта значыць, кожная кватэра, якая належыць грамадзянам, цяпер будзе абкладацца падаткам на нерухомасць. Змяненне выраўноўвае ўмовы падаткаабкладання ўладальнікаў жылых дамоў і ўладальнікаў кватэр, паколькі ўладальнікі жылых дамоў, дач, садовых домікаў выплачвалі і раней падатак на нерухомасць з кожнага такога аб'екта, а ўладальнікі кватэр — толькі з другой кватэры.

Пры гэтым для пэўных катэгорый грамадзян, якія маюць патрэбу ў падтрымцы з боку дзяржавы, як і раней, льгота захоўваецца, аднак абмяжоўваецца толькі адной кватэрай, а па другой і наступных кватэрах падатак неабходна выплаціць. Для шматдзетных сем'яў захавана льгота па ўсіх кватэрах, якія ім належаць.

— Змены закранулі і тэрміны аплаты такіх падаткаў?

— Іншым значным змяненнем з'яўляецца пераход да аплаты насельніцтвам падатку на нерухомасць і зямельнага падатку пасля завяршэння каляндарнага года (да 2022-га гэтыя падаткі выплачваліся грамадзянамі ў бягучым годзе). Так, напрыклад, за 2023-і падаткі фізічнымі асобамі будуць падлягаць аплаце не пазней за 15 лістапада 2024 года і гэтак далей.

А для сум падаткаў, якія неабходна выплаціць грамадзянамі за 2022 год, гэта значыць, у пераходны год, прадугледжана аплата ў два этапы па двух тэрмінах: не пазней чым 15 лістапада 2022 года — авансавы плацеж у памеры 50 % ад вылічаных сум, і не пазней чым 15 лістапада 2023 года — астатняя сума падаткаў.

Такая схема аплаты дазволіць аднойчы ўлічыць усе змены, якія адбыліся з аб'ектамі падаткаабкладання на працягу каляндарнага года, палічыць грамадзянам падатак выключна за перыяд фактычнага знаходжання нерухомасці ва ўласнасці або карыстанні канкрэтнага плацельшчыка без наступнага перараховання. У цэлым такі падыход значна спросціць працэдуру разліку падаткаў, зрабіўшы яе больш зразумелай, зручнай і эфектыўнай як для простых людзей, так і для падатковых органаў.

З гэтага года таксама ўніфікаваны парадак вызначэння кошту аб'ектаў нерухомасці для мэт вылічэння грамадзянам падатку на нерухомасць. Гэты кошт будзе вызначацца падатковымі органамі шляхам множання кошту аднаго квадратнага метра для тыпавога аб'екта (устаноўлены Падатковым кодэксам) на плошчу аб'екта нерухомасці, па якім вылічаецца падатак.

— Уладальнікі нават адной кватэры ў шматкватэрных жылых дамах цяпер будуць абавязаны заплаціць падатак на нерухомасць. Ці дастатковa гэта вялікія сумы?

— Сумы падатку на нерухомасць, якія будуць прад'яўляцца ўладальнікам кватэр за гэты год, невялікія. Так, падатак на нерухомасць для кватэры плошчай 60 квадратных метраў складзе ад 30 рублёў у невялікіх населеных пунктах да 50 рублёў у горадзе Мінску.

Пры гэтым неабходна адзначыць, што ў 2022 годзе грамадзянамі будзе аплачвацца толькі авансавы плацеж па падатку ў памеры 50 % ад вылічаных сум падаткаў, адпаведна, сёлета выплаціць неабходна будзе падатак на нерухомасць у памеры ад 15 да 25 рублёў.

— Цікава, а ад чаго залежыць памер падатку?

— Падатак на нерухомасць залежыць ад віду аб'екта нерухомасці (гараж, жылы дом, кватэра ці іншае), яго плошчы, а таксама ад месца размяшчэння такога аб'екта (у Мінску, у абласных цэнтрах, іншых населеных пунктах).

— Такі падатак на нерухомасць выплачваецца раз на год або яго магчыма аплаціць часткамі?

— Фізічныя асобы абавязаны аплаціць падатак на нерухомасць у тэрмін не пазней за 15 лістапада года, наступнага за справаздачным. Пры гэтым не мае значэння: адной сумай або ў некалькі плацяжоў выплачваецца падатак.

Яшчэ раз нагадаю пра асаблівасць аплаты падатку за 2022 год. Такая аплата будзе праводзіцца па двух тэрмінах: не пазней за 15 лістапада 2022 года — авансавы плацеж у памеры 50 % вылічаных сум, не пазней за 15 лістапада 2023 года — астатняя сума падатку.

— Ільгота па падатку на адну кватэру адмяняецца, але не для ўсіх. Хто вызваляецца ад такога падатку і цяпер?

— Ільгота захавалася для пэўных катэгорый фізічных асоб, якія маюць патрэбу ў падтрымцы з боку дзяржавы. Да іх адносяцца пенсіянеры, інваліды I і II групы, непаўналетнія дзеці, ветэраны і шэраг іншых катэгорый фізічных асоб, для якіх адна кватэра вызваляецца ад падатку, а падатак выплачваецца толькі з другой і наступных кватэр.

Члены шматдзетных сем'яў вызваленыя ад падатку па ўсіх сваіх кватэрах.

— Ці магчыма вызваліцца ад аплаты падатку на нерухомасць па нейкіх іншых прычынах (цяжкае матэрыяльнае становішча, гібель блізкіх сваякоў або іншае)?

— Падатковым кодэксам прадугледжана магчымасць вызвалення грамадзян ад аплаты падатку ў сувязі са знаходжаннем такіх асоб у цяжкай жыццёвай сітуацыі. Пры гэтым рашэнне аб вызваленні прымаецца мясцовым выканаўчым камітэтам.

— Так, разабраліся з сітуацыяй, калі чалавек валодае адной кватэрай. А ў каго ёсць дзве (і больш) кватэры, цяпер будуць плаціць у два разы больш або, магчыма, у разы? Для гэтай катэгорыі грамадзян падатак на нерухомасць на другую (і больш) кватэру можа павялічвацца мясцовымі ўладамі, як гэта было і раней?

— З 2022 года адменена стаўка падатку на нерухомасць у памеры 0,2 %, якая выкарыстоўвалася раней пры разліку падатку на нерухомасць грамадзянам, якія валодаюць дзвюма і больш кватэрамі. Гэта значыць, цяпер такія асобы будуць аплачваць падатак па агульнаўстаноўленай стаўцы ў памеры 0,1 працэнта ад кошту нерухомасці.

Акрамя таго, пры разліку падатку на нерухомасць уладальнікам кватэр (як адной, так і некалькіх) не будуць прымяняцца павышаныя каэфіцыенты, якія ўстанаўліваюцца рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Таму для ўладальнікаў дзвюх і больш кватэр падатак на нерухомасць істотна не павялічыцца.

— Хто павінен у гэтым годзе плаціць транспартны падатак? Ад чаго залежыць памер транспартнага падатку для простага абывацеля — уласніка транспартнага сродку?

— Плацельшчыкамі транспартнага падатку з'яўляюцца грамадзяне, у тым ліку зарэгістраваныя ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, за якімі ў ДАІ МУС зарэгістраваныя транспартныя сродкі.

У бягучым годзе грамадзянамі будзе праводзіцца канчатковая даплата транспартнага падатку за 2021 год (у мінулым годзе імі выплачваўся фіксаваны авансавы плацеж у памеры 20 або 29 рублёў у залежнасці ад тыпу транспартнага сродку).

Стаўкі транспартнага падатку ўстаноўлены Падатковым кодэксам і дыферэнцыраваны ў залежнасці ад дазволенай максімальнай масы (для легкавых і грузавых аўтамабіляў), ёмістасці транспартнага сродку (для аўтобусаў) альбо вызначаюцца за адну адзінку транспартнага сродку (для прычэпадачы (каравана), матацыкла і седлавога цягача).

Напрыклад, гадавая сума падатку за легкавы аўтамабіль з дазволенай максімальнай масай ад 1,75 тоны да 2 тон складае 102 рублі, а для матацыкла — 41 рубель.

На сайце міністэрства ў раздзеле «Транспартны падатак» можна больш падрабязна азнаёміцца з інфармацыяй аб стаўках транспартнага падатку.

— Як даведацца пра свой падатак на машыну?

— Сума транспартнага падатку, якая падлягае даплаце за 2021 год, будзе адлюстравана ў паведамленні падатковага органа, якое накіроўваецца грамадзянам не пазней за 1 верасня гэтага года.

Да гэтага ж перыяду ўсе налічэнні будуць адлюстраваны ў электронным сэрвісе падатковых органаў «Асабісты кабінет плацельшчыка» і размешчаны ў сістэме «Разлік» (АРІП).

— Калі і як плаціць транспартны падатак у гэтым годзе?

— Даплату транспартнага падатку за 2021 год спатрэбіцца зрабіць не пазней як 15 лістапада гэтага года.

Аплату транспартнага падатку можна ажыццявіць рознымі спосабамі: на пошце, у банку, праз электронны сэрвіс «Асабісты кабінет плацельшчыка» альбо праз сістэму «Разлік» (АРІП) (праз інтэрнэт-банкінг, мабільны банкінг).

— Хто мае льготы па аплаце транспартнага падатку?

— У Падатковым кодэксе вызначана катэгорыя грамадзян, для якіх знімаюцца стаўкі транспартнага падатку.

Так, стаўка транспартнага падатку памяншаецца:

• на 50 працэнтаў у дачыненні да транспартных сродкаў, зарэгістраваных за:

• ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны;

• інвалідамі I або II групы;

• асобамі, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, або асобамі, якія маюць права на пенсію па ўзросце са зніжэннем агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту;

• на 25 працэнтаў — для інвалідаў III групы.

Аднак дадзеная льгота даецца толькі пры ўмове наяўнасці ў грамадзяніна сапраўднага пасведчання кіроўцы адпаведнай катэгорыі.

Таксама поўнае або частковае вызваленне ад выплаты транспартнага падатку па транспартных сродках, якія не выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, маюць права атрымаць грамадзяне, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Рашэнне аб вызваленні прымаецца мясцовым выканаўчым камітэтам.

— У мяне ёсць машына, яна на ходу, але я ў ёй не езджу. Ці трэба мне плаціць такі падатак? А калі машына патрабуе рамонту?

— Аб'ектам падаткаабкладання транспартным падаткам прызнаюцца транспартныя сродкі, зарэгістраваныя за грамадзянамі ў ДАІ МУС, гэта значыць, непасрэдна маёмасць грамадзяніна.

Адпаведна, вылічэнне транспартнага падатку ажыццяўляецца незалежна ад удзелу транспартнага сродку ў дарожным руху і яго тэхнічнага стану.

Сяргей КУРКАЧ.

Аты-баты

Вясна колеру хакі

Пачалася адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні

У першы дзень каля тысячы прызыўнікоў папоўніла шэрагі сіл спецыяльных аперацый, 72-га Аб'яднанага вучэбнага цэнтра і Мінскай ваеннай камендатуры. Усяго на ўкамплектаванне Узброеных Сіл, іншых войск і воінскіх фарміраванняў нашай краіны гэтай вясной плануецца накіраваць каля дзесяці тысяч чалавек. Яшчэ каля дзвюх соцень грамадзян будзе праходзіць службу ў рэзерве.

Фота БелТА.

Сярод іх — студэнты вышэйшых навучальных устаноў сельскагаспадарчага профілю, якія вырашылі, што тры гады запар свае летнія канікулы правядуць у арміі. У выніку разам з дыпломам аб адукацыі яны атрымаюць і ваенны білет. Падобны эксперымент ва Узброеных Сілах правялі летась, калі 50 студэнтаў-аграрыяў вырашылі такім чынам закрыць сваё пытанне з арміяй. Сёлета ахвотныя правесці свае летнія канікулы згодна з воінскім статутам таксама ёсць. Да службы маладыя людзі прыступяць у лістападзе, пасля здачы залікаў і экзаменаў у ВНУ.

Як адзначыў **начальнік аддзела прызыву на вайсковую службу галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Алег ПАЗНЯК,** у цяперашні час праводзяцца мерапрыемствы па медыцынскім аглядзе грамадзян. «Гэтай вясной выкліку на прызыўныя камісіі падлягаюць каля 43 тысяч маладых людзей, — паведаміў прадстаўнік Генштаба. — У адносінах да больш чым 23 тысяч грамадзян раённымі (гарадскімі) прызыўнымі камісіямі ўжо прыняты рашэнні. Дадзена больш як 13 тысяч адтэрміновак, большасць з якіх — звыш 87 % — складаюць адтэрміноўкі для працягу адукацыі».

У ваенных камісарыятах раёнаў (гарадоў) і іх падраздзяленнях завяршаецца планавая работа па ўсебаковым вывучэнні і прафесійным псіхалагічным адборы прызыўнікоў для камплектавання Узброеных Сіл, іншых войск і воінскіх фарміраванняў Рэспублікі Беларусь. Адпраўка ў войскі працягнецца да 16 мая, усе мерапрыемствы прызыву завершацца да 1 чэрвеня. Новае папаўненне, якое прыбудзе ў злучэнні і воінскія часці, пройдзе двухтыднёвы каранцін.

Аляксей Грук — адзін з тых, хто гэтай вясной у ліку першых адпраўляецца ў армію. Падтрымаць маладога чалавека на прызыўны пункт прыйшоў бацька. Нягледзячы на тое, што адпраўляе ў армію адзінага сына, Іван Грук спакойны. Сам некалі служыў у войсках сувязі, пераканаты, што праз гэта павінен прайсці і яго нашчадак. «Армія вучыць чалавека жыць у мужчынскім калектыве, — кажа бацька навабранца. — Цяперашняя моладзь нярэдка слаба арыентуецца ў мужчынскім грамадстве. Маладыя людзі большасць часу праводзяць у камп'ютары, мала з кім маюць зносіны, а калі трапляюць у асяроддзе сваіх аднагодак, пачынаюць вучыцца знаходзіцца ў грамадстве — праўда, у паскораным тэмпе».

Па прафесіі Аляксей — інжынер-канструктар. Паколькі мае вышэйшую адукацыю, служыць будзе год. Дзе канкрэтна, пакуль не ведае. Кажа: для яго галоўнае — атрымаць гэты вопыт і прымяніць яго ў жыцці. «Мне служба патрэбна: я яшчэ малады, з гарачым сэрцам, часама мне не хапае сілы духу, самастойнасці і здаецца, што армія — акурат тое месца, дзе гэтаму можна навучыцца», — пераканаты малады чалавек.

Мінчаніна Дзмітрыя Патапенку праводзіць у армію прыйшлі цэлым сямействам: бацькі, сястра, яе муж і дачка. Бацька прызыўніка Аляксандр Аляксандравіч кажа, што дахаты сын прыйдзе ўжо дарослым, сапраўдным мужчынам. Маці Святлана Міхайлаўна свае перажыванні не хавае: кажа, што час такі. «Сын нас настройвае на тое, каб мы не хвалявaліся, — кажа жанчына. — Мы ўпэўнены ў ім: як жа іначай, калі ён на працягу двух гадоў сам хадзіў у ваенкамат і прасіў, каб яго хутчэй прызвалі».

Малады чалавек будзе служыць у Мар'інай Горцы, у спецназе. Не выключае таго, што пасля арміі паступіць у Ваенную акадэмію або на ваенны факультэт грамадзянскай ВНУ. Дзмітрый ведае, што тым, хто добрасумленна выканае свой воінскі абавязак, пры паступленні даюцца пэўныя льготы, і плануе імі скарыстацца.

Ваенная прысяга новага папаўнення ў злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл адбудзецца 21 мая. Звальненне ў запас ваеннаслужачых, якія выслужылі патрэбныя тэрміны, будзе праведзена ў адпаведнасці з заканадаўствам своечасова, у маі 2022 года.

Вераніка КАНЮТА.

Зварот у рэдакцыю

СВЯТЛО НА ВЯСКОВАЙ ВУЛІЦЫ

Асабіста ў мяне ёсць не вельмі прыемны ўспамін пра адключэнне святла. Перад сном паставіла рошчыну на хлеб. Раніцай прачнулася з неўнямі, каб замясіць цеста. Пасля зробленай працы, задаволеная, вырашыла заварыць кавы, але вада з крана не пацякла (у нас электрапомпа) і электрапліта не ўключылася... Святло з'явілася толькі ў шэсць гадзін вечара. Таму засталіся мы ў той дзень без хлеба, цеста прыйшлося выкінуць у кампосную яму.

Згадала гэтую гісторыю, калі прачытала пісьмо, якое прыйшло ў рэдакцыю ад жыхара вёскі Раз'езд Фалічы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Віктар Шасцюк скардзіцца на тое, што кожны месяц у вёсцы адключаюць святло, могуць і па некалькі разоў. «У выніку адключаецца халадзільнік, псуюцца прадукты. Відавочна, з-за гэтага я нясу страты, у тым ліку і маральны ўрон». Віктар Іванавіч лічыць, што мясцовыя ўлады абыякава ставяцца да вёскі і да яе жыхароў. У якасці прыкладу даслаў фота вясковай трансфарматарнай падстанцыі. Маўляў, летась быў капрамонт. «Але, паглядзеўшы на гэтую трансфарматарную падстанцыю, міжволі падумаеш пра нямэтавае выкарыстанне дзяржсродкаў. Яна нават не агароджана, таму любы зламыснік можа туды залезці. Хочацца даведацца, ці пайшлі дзяржаўныя грошы, у тым ліку і мае як падаткаплацельшчыка, на капрамонт? І чаму такая вакханалія са святлом?»

Віктар Іванавіч кажа, што ўжо не раз скардзіўся на мясцовыя электрасеткі, у тым ліку пісаў і ў Міністэрства энергетыкі. Паводле яго слоў, нават кагосьці са спецыялістаў прыцягвалі да адказнасці за тое, што парушаюць правілы этыкі пры размове падчас звароту. «Не скажу, што няма паляпшэнняў, нейкія ўсё ж ёсць у параўнанні з мінулымі гадамі. Але, тым не менш, могуць адключыць святло на секунду, на хвіліну, калі захочуць. Хоць па законе абавязаны папярэджваць жыхароў праз газету, сайт. Для апавяшчэння насельніцтва любыя сродкі добрыя, чым больш, тым лепш».

У Старадарожскім сельвыканкаме, куды я патэлефанавала, каб даведацца, ці сапраўды ў вёсцы крытычная сітуацыя са святлом, мне сказалі, што першы раз пра гэта чуюць. «Святло ў нас гарыць, ніякіх заявак ад людзей не паступала», — кажа **Любоў ЖЭЛДАК, кіраўнік спраў Старадарожскага сельвыканкама.** — «Але ж у рэдакцыю прыйшоў ліст ад вашага жыхара...» — «Ад Віктара Шасцюка, напэўна. Дык яго ж увесь раён ведае. Ён бясконца піша новыя скаргі, на ўсіх і на ўсё. То аўтобус не так ходзіць, то цягнік, то пераезд не так зрабілі, то аўталаўка дрэнна ездзіць, і трэба зрабіць для яе навес, то неабходна добраўпарадкаваць і заасфальтаваць вуліцу, то ДАІ без толку ездзіць, то лясгас вырубае лес незаконна... Я не ведаю, на што ён толькі не скардзіўся! Неяк даслаў нам фота на электронную скрыню: «Жанчына нейкая сноўдаецца ў Раз'ездзе Фалічы, напэўна, бомж. Прыміце меры!». Пастаянна чымсьці не задаволены. Усё яму не так».

Паводле слоў Любові Жэлдак, калі Старадарожскі РЭС плануе нейкія рамонтныя работы, яны заўсёды тэлефануюць у сельвыканкам і папярэджваюць. «Мы ж, у сваю чаргу, перадаём інфармацыю пра адключэнне святла жыхарам вёсак. Аб'яву вешаем на чыгуначнай станцыі. І я стараюся пазваніць людзям, маўляў, вы перадайце таму канцу, вы — іншаму. Ніколі ніхто не абураецца. Усё людзі разумеюць. Віктару Іванавічу ўжо асабіста званю, бо ведаю, што будзе скардзіцца. Але ён усё адно не задаволены, яму проста не падабаецца, што адключаюць святло. Людзі розныя, што ж зробіш. Трэба з усімі працаваць.

«Для бяспечнага выканання работ мы абавязаныя «абясточыць спажыўцоў». У нас, на жаль, пакуль няма такіх тэхналогій, каб рабіць рамонт, не адключаючы святло».

У Раз'ездзе Фалічы не часцей, чым у іншых вёсках, знікае святло. Апошні раз адключалі ўзімку, у лютым, калі не памыляюся. Проста калі тэлефануюць і кажуць, што адбудуцца рамонтныя работы ў Раз'ездзе Фалічы, мне ўжо страшна, бо ведаю, што паступіць чарговая скарга ад Шасцюка. Папярэдзіў яго ці не — усё адно ён лічыць, што парушаюцца яго чалавечыя правы. А як быць? Электрасеткі ж не дзеля забавы адключаюць святло, у іх ёсць свой графік, ім неабходна правесці рамонтныя работы».

У Старадарожскім РЭС Віктара Шасцюка таксама ведаюць не па чутках.

«Часам даводзіцца, каб пераключыцца з адной лініі электрапередачы на іншую, на адну хвіліну адключыць святло, — кажа **начальнік Старадарожскага РЭСа Дзмітрый ТУРБАН.** — Дык вось Вітар Шасцюк пачынае завальваць нас скаргамі, чаму яго не папярэдзілі за тры дні, што будзем праводзіць аператыўнае пераключэнне. Вядома, калі праводзім планавыя рамонтныя работы па замене правадоў, дэмантажу апор і адключаем святло на цэлы дзень, абавязкова за тры дні папярэджваем аб гэтым. Даём інфармацыю на сайце, рассылаем смс-паведамленні. Выконваем усе прадпісанні, але ўсё адно Віктар Іванавіч скардзіцца.

— А калі апошні раз адключалі святло ў Раз'ездзе Фалічы?

— 29 сакавіка.

— У сельсавеце ж сказалі, што ўзімку...

— З сельсаветамі мы ўжо не працуем, у нас зараз ёсць сістэма смс-апавяшчэнняў. Кожнаму жыхару населенага пункта, які даў згоду на рассылку, высылаем смс-паведамленне. Таксама інфармацыя аб планавых рамонтных работах размяшчаецца на сайце РУП «Мінскэнерга».

Разам з тым няштатныя сітуацыі ніхто не адмяняў. «Напрыклад, калі дзьмуць моцныя вятры, можа штосьці пашкодзіцца, і знікне святло. Працягласць ліній электрапередач вялікая, да адной падключана вельмі шмат вёсак. Каб выявіць прычыну адключэння святла, патрэбны час. Зразумела, у выпадку аварый мы ніяк не можам загадзя людзей папярэдзіць. На жаль, не ўсе гэта разумеюць».

Што датычыцца капрамонту ліній электрапередачы, то ён праводзіцца раз на 10 гадоў. «Летась была чарга Раз'езда Фалічы. Мы зрабілі капрамонт паветранай лініі электрапередачы 10 кВ: мянялі ізалятары, правады, траверсы. Усё зрабілі па рэгламенце. Напрыканцы мінулага тыдня прыступілі да мадэрнізацыі трансфарматарнай падстанцыі ў гэтым населеным пункце. Інфармацыю аб правядзенні планавых рамонтных работ вывешвалі на сайт. І зноў Віктар Шасцюк будзе незадаволены, што святло адключалі. Але ж для бяспечнага выканання работ мы абавязаныя «абясточыць спажыўцоў». У нас, на жаль, пакуль няма такіх тэхналогій, каб рабіць рамонт, не адключаючы святло. Што датычыцца агароджы, то вясковыя трансфарматарныя станцыі, згодна з усімі стандартамі і нормамі, не агароджваюцца».

У кожнага, як бачыце, свая праўда. Хоць, часта бывае, яна дзесьці пасярэдзіне. З аднаго боку любая скарга, нават самая неістотная, забірае час, бо на яе трэба рэагаваць. З другога боку, заўвагі

Трансфарматарная падстанцыя.

дапамагаюць паглядзець на сітуацыю збоку, задумацца, што можна палепшыць у сваёй працы, ці насамрэч усё так ідэальна?

Упэўнена, што любы жыхар хоча, каб яго вёска квітнела, развівалася, была спрыяльнай для жыцця. Скаргі, як мне бачыцца, таксама пішуцца з гэтай мэтай. Пераканана, што таго ж самага хочуць і прадстаўнікі мясцовай улады, хоць бы таму, што яны таксама жывуць на гэтай тэрыторыі. Вядома, не заўсёды на ўсё ёсць сродкі і магчымасці, але можна ж вырашаць пытанні паступова. А каб менш узнікала непаразуменняў і ўзаемная незадаволенасць не назапашвалася і не ператваралася ў снежны камяк, трэба больш размаўляць з людзьмі, тлумачыць. Ведаю гэта па сваёй сям'і. А раён, а тым больш сельсавет, — гэта таксама ў нейкім сэнсе сям'я.

І яшчэ пасля размовы ў мяне склалася адчуванне, што электрасеткам не трэба спяшацца прыпыняць супрацу з сельвыканкамамі. Бо хто, як не гэтыя людзі, лепш за ўсё ведаюць мясцовых жыхароў? Вось у сельвыканкаме згадваюць, што апошняе адключэнне святла ў Раз'ездзе Фалічы адбывалася ўзімку, але, паводле слоў начальніка Старадарожскага РЭС, яно было 29 сакавіка. Атрымліваецца, пра гэта ў сельсавеце не ведалі, бо электрасеткі апавяшчалі жыхароў праз сайт і смс-паведамленні. А што рабіць, калі ў чалавека няма мабільнага тэлефона, як у таго ж Віктара Шасцюка? Канешне, можна паспадзявацца на «вясковае радыё», што людзі адзін аднаму перададуць. А калі не?.. Не думаю, што на сайт РУП «Мінскэнерга» рэгулярна зазірае кожны вясковы жыхар. Таму, можа быць, варта працягнуць супрацоўнічаць з сельвыканкамамі, пакуль сістэма смс-паведамленняў не будзе адладжана.

На месцы ж любога незадаволенага вяскоўца, які напісаў чарговую скаргу, падумала б: а што асабіста я магу зрабіць, каб палепшыць жыццё на вясковай вуліцы? У вёсачцы, дзе жыву сама, напрыклад, шматдзетны тата сваімі рукамі зрабіў зону адпачынку каля рэчкі, яшчэ адзін жыхар памяняў зламаны крыж на ўездзе ў населены пункт на новы і запрасіў бацюшку яго асвяціць. Недарэмна ж кажуць, што добры прыклад, як і дрэнны, таксама заразлівы.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

Будзь у курсе!

НА СВЯТЫ БІЛЕТАЎ ХОПІЦЬ УСІМ

Больш за сто дадатковых цягнікоў прызначана на перыяд майскіх свят. У мэтах паляпшэння якасці абслугоўвання пасажыраў Беларуская чыгунка прадаўжае работу па назначэнні дадатковых цягнікоў з уліка прагназаванага росту пасажырапатоку ў дні майскіх свят і Радаўніцы, інфармуе прэс-цэнтр магістралі.

Так, 29-30 красавіка дадаткова прызначаны цягнік міжнародных ліній № 250/249 у паведамленні Мінск—Санкт-Пецярбург—Мінск. Ён адправіцца з Мінска 29 красавіка ў 19.15, каб прыбыць у Санкт-Пецярбург раніцай наступнага дня ў 9.20. У зваротным напрамку састаў адправіцца з Санкт-Пецярбурга 30 красавіка ў 14.26 з прыбыццём у Мінск 1 мая ў 5.08.

Таксама на перыяд з 29 красавіка да 10 мая ва ўнутрырэспубліканскіх зносінах прызначаны дадатковыя цягнікі па маршрутах Мінск—Брэст, Мінск—Гомель і Мінск—Жлобін.

Нагадаем, раней на перыяд з 29 красавіка да 10 мая было прызначана 75 дадатковых цягнікоў. У цэлым у дні майскіх свят і Радаўніцы па найбольш запатрабаваных у пасажыраў напрамках будуць курсіраваць 105 дадатковых цягнікоў. Квіткі на іх ужо даступныя ў продажы.

ПЕРАЗДАЛА ЧУЖУЮ КВАТЭРУ ЯК СВАЮ

Падазраваная ў махлярстве 40-гадовая жыхарка Оршы была затрымана супрацоўнікамі Кастрычніцкага РАУС. Жанчына знаходзілася ў вышуку і хавалася ад праваахоўнікаў у абласным цэнтры.

Некалькі месяцаў таму яна зняла кватэру і праз некаторы час перастала за яе плаціць. Больш за тое, зламысніца размясціла ў інтэрнэце аб'яву аб здачы чужых квадратных метраў, паведамляе УУС Віцебскага аблвыканкама.

На яе адгукнуўся 23-гадовы студэнт-замежнік. Падчас сустрэчы з патэнцыяльным кватэранаймальнікам аршанка забрала перадаплату ў 250 рублёў і перадала яму ключы. Пасля гэтага жанчына ўцякла.

Афера выявілася, калі малады чалавек прыйшоў па адрасе і выявіў, што ключы ад кватэры не падыходзяць да замкоў.

Іх да таго часу ўжо здолеў змяніць сапраўдны гаспадар. Ашуканы малады чалавек звярнуўся ў міліцыю.

У дачыненні да жанчыны распачалі крымінальную справу па факце махлярства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. УНП 191224638**
Продавец	**ИООО «АРВИБЕЛАГРО», Гродненская обл., Лидский р-н, Лидский с/с, М-11, 39-й км, 5, 8 (тел. +375 29 130-85-30) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 81-4Б/2020. УНП 590700407**

Предмет аукциона

КОМПЛЕКС ПО ПРОМЫШЛЕННОМУ ПРОИЗВОДСТВУ ПРОДУКЦИИ ИЗ МЯСА ИНДЕЙКИ ИООО «АРВИБЕЛАГРО»

Состав имущества см. на сайте ipmtorgi.by

Месторасположение объектов недвижимости, входящих в состав комплекса:
1) завод «АРВИБЕЛАГРО» по промышленному производству продукции из мяса индейки, площадь участка 16,7324 га – Гродненская обл., Лидский р-н, М-11, 39-й км, 5;
2) комплекс по промышленному производству продукции из мяса индейки, площадь 5,3229 га – Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, 20, площадка № 6;
3) комплекс по промышленному производству продукции из мяса индейки, площадь 6,0209 га – Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, 19, площадка № 5;
4) ферма для откорма индейки, площадь 6,4989 га – Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, 21, площадка № 7;
5) пометохранилище, площадь участка 1,1262 га – Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, в районе д. Жомойди.
С перечнем земельных участков, отведенных под инженерные коммуникации, можно ознакомиться на сайте ipmtorgi.by

Начальная стоимость без НДС – 26 015 958,10 бел. руб.
(снижена на 30 %)
Шаг аукциона без НДС – 1 300 797,91 бел. руб.

Обременения: на территории земельного участка завода «АРВИБЕЛАГРО» (кадастровый номер 423684300049000010) расположены два объекта незавершенного строительства, которые не входят в состав лота и будут демонтированы для реализации в качестве строительных материалов. Освобождение земельного участка от данных объектов возможно после их реализации

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Залуцкая Анна Леонидовна, тел. +375 44 7148418; Симонова Регина Владимировна, тел. +375 29 3974469

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17:00:00 **11.05.2022** заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 вышеуказанного Закона.
Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.
Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол.
В случае если торги признаны несостоявшимися в связи с тем, что на участие в них подано заявление только одним участником торгов либо для участия в них явился только один участник, в протокол вносится информация о согласии на покупку этим участником торгов предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
В случае неисполнения Покупателем обязательств по оплате цены договора (отказа, уклонения от заключения договора купли-продажи, отказа от исполнения, неисполнения договора купли-продажи) сумма задатка остается у Продавца в порядке ст. 352 Гражданского кодекса Республики Беларусь.
Покупатель осуществляет принятие имущества в месте его нахождения собственными силами и за свой счет по его фактическому состоянию без каких-либо дополнительных условий. Все расходы по заключению, оформлению и регистрации договоров купли-продажи, расходы по государственной регистрации перехода права собственности на имущество, снятию с учета и постановке на учет имущества несет Покупатель

Срок подписания договора купли-продажи	После возмещения фактических затрат на организацию и проведение торгов в течение 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения торгов

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 0,2 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте ipmtorgi.by

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 30.03.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия, но не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов

Аукцион состоится 13.05.2022 в **11:00:00**
по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.
Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9:00:00 26.04.2022 по 11.05.2022 до 17:00:00 по указанному адресу

Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06,
www.cpo.by. E-mail: info@ipmtorgi.by

6 мая 2022 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элегант».

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. О совершении сделок.

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 09.30 до 10.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров: 1 мая 2022 г.

Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 29.04.2022 г., по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400078331

Извещение о проведении 19 мая 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов

Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а 1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4)

Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211

Местонахождение:
Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1

Начальная цена: 1 193 630,40 бел. руб. с учетом НДС

Сумма задатка: 119 363,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **19 мая 2022 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 26.04.2022 по 17.05.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by**
Продавец	**ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23, тел. 8017-215-36-65**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by**

Предмет электронного аукциона – имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Брест, ул. Я. Купалы, 110/2

Наименование (назначение), инвентарный номер	Общая площадь
Гараж (здание специализированное автомобильного транспорта), инв. номер 100/С-46058	605,2 кв. м
Хозяйственно-бытовой блок (здание административно-хозяйственное), инв. номер 100/С-69143	296,5 кв. м
Тепловая сеть (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 100/С-60856	протяженность – 164,8 м
Линия наружного освещения (сооружение специализированное энергетики), инв. номер 100/С-60859	протяженность – 221,7 м
Кабельная линия электропередачи (сооружение специализированное энергетики), инв. номер 100/С-60857	протяженность – 272,9 м
Водопроводная сеть (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер 100/С-60860	протяженность – 38,9 м
Канализационная сеть (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 100/С-60858	протяженность – 81,8 м
Водопроводная сеть (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер 100/С-60855	протяженность – 33,0 м

В состав лота входит иное имущество. Перечень размещен на сайте организатора аукциона www.cpo.by и на электронной площадке ИПМ-Торги: www.ipmtorgi.by

Сведения о земельном участке	Предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,2295 га для обслуживания гаража и здания хозяйственно-бытового блока
Начальная цена с НДС 20 %	**1 204 551,65 белорусского рубля**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

Срок заключения договора купли-продажи	**20 календарных** дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона
Условия оплаты предмета электронных торгов	Оплата должна быть произведена не позднее **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Передача предмета электронных торгов осуществляется не позднее 10 рабочих дней после полной оплаты

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 2 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 10.12.2021 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов	Начало торгов: **10.00 17.05.2022 г.** Окончание торгов: **11.00 17.05.2022 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.05.2022 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

УЗДЕНСКИЙ РАЙИСПОЛКОМ 24 мая 2022 г. в 11.00 по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22 (кабинет № 213) проводит повторный открытый аукцион (лот № 1) (далее – аукцион) по продаже указанного в таблице не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания жилых домов и предоставлении их победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	Кадастровый номер, S (га)	Начальная цена, бел. руб.	Недвижимое имущество (не завершенное строительством, незаконсервированное строение)	Расходы по подготовке, бел. руб.	Примечание
Лот № 1	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Полевая, уч. 5	625650100002000196 0,1498 га	19 726,22	Фундамент	1181,38 и расходы на публикацию	Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению

Целевое назначение участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Аукцион будет проводиться в порядке, установленном пунктами 20–33 Положения о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 26 декабря 2017 г. № 463».

Начальная цена предмета повторного аукциона (лот № 1) – 19 726, 22 белорусского рубля, в том числе:

начальная цена не завершенного строительством жилого дома – 3 226, 22 белорусского рубля;

начальная цена продажи земельного участка – 16 500,00 белорусского рубля;

затраты на организацию и проведение аукциона составляют 1181,38 белорусского рубля.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона перечисляется в срок **не позднее 19 мая 2022 г.** платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 4707, назначение платежа: задаток для участия в аукционе.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет № 407, заместителем начальника отдела жилищно-коммунального хозяйства, архитектуры и строительства Узденского райисполкома с 08.30 до 17.30 в рабочие дни. Окончательный срок приема заявлений с необходимыми документами: **20 мая 2022 г. с 08.30 до 17.30.**

Участники аукциона, которыми могут быть граждане Республики Беларусь и негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подают следующие документы:

заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона;

документ о внесении суммы задатка с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию по проведению аукциона или Узденский райисполком по вышеуказанному адресу участниками аукциона представляются:

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Заключительная регистрация участников аукциона – с 09.00 до 10.25 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по лоту № 1 при наличии не менее двух участников. Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Порядок осмотра на местности предмета аукциона осуществляется путем самостоятельного выезда желающими принять участие в аукционе к месту нахождения объектов.

Контактные телефоны председателя и секретаря комиссии: 8 (01718) 65-4-75, 51-6-70; моб. тел.: 8 (033) 604-49-71.

ДРЭННЫ ХАРАКТАР ЦІ ХВАРОБА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Людзі сталі часцей дажываць да такіх праблем як дэменцыя. І пазбегнуць гэтага мы не зможам, бо чаканая працягласць жыцця павялічваецца. Захворванне асабліва будзе расці ва ўзроставай групе 75+. Кожны чалавек у гэтым узросце, як правіла, мае некалькі хранічных захворванняў, якія ўплываюць і на псіхічнае здароўе. Дэменцыя мае пераважна жаночае аблічча. Характэрна, што захворванне цяпер памаладзела — яно можа з'яўляцца і ў людзей працаздольнага ўзросту, — расказвае спецыяліст.

У нашай краіне распрацавана некалькі дзяржаўных праграм, накіраваных у тым ліку і на захаванне псіхічнага здароўя. Адна з іх — Нацыянальная стратэгія «Актыўнае даўгалецце 2020—2030». Галоўная іх задача — прафілактыка псіхічных расстройстваў сярод пажылых людзей.

— Прафілактыку трэба пачынаць не тады, калі захворванне пачало сябе праяўляць, а значна раней, — звяртае ўвагу Людміла Жылевіч. — Дзяржпраграмы накіраваны на тое, каб паказаць, што пенсіённы ўзрост — гэта не тая мяжа, за якой вас чакаюць адзінота і дэменцыя. Чалавек можа рэалізаваць сябе ў любым узросце.

У асноўным гэта кірункі, па якіх можа дзейнічаць чалавек ва ўзросце 65+ — перапрафіляванне, навучанне, вольны час. Пажылы ўзрост мае адну асаблівасць — чалавек пачынае менш рухацца ці ўвогуле перастае тое рабіць. А гэта адна з непасрэдных прычын росту дэменцыі, — падкрэслівае яна.

Людміла Жылевіч адзначае, што ўзровень занятасці насельніцтва ва ўросце 60+ сёння недастатковы. Калі да 2015 года назіраўся яго пастаянны рост, то сёння — падзенне. А між іншым, незалежнасць пажылога чалавека, у тым ліку і фінансавая, — асноўны кампанент яго добрага псіхічнага самаадчування.

Аднак больш важкай прычынай дэменцыі з'яўляецца ўсё ж пагаршэнне фізічнага здароўя. Напрыклад, працяглы рост масы цела, а гэта метабалічны сіндром. Таксама ўплывае артэрыяльная гіпертэнзія. А павышэнне артэрыяльнага ціску, між іншым, можа прывесці да сасудзістай дэменцыі. У сваю чаргу, высокія лічбы артэрыяльнага ціску, лішняя вага вядуць да парушэння талерантнасці да глюкозы і, як вынік, цукровага дыябету.

— Развіццё сасудзістай дэменцыі зваротнае, у адрозненні ад хваробы Альцгеймера — найбольш распаўсюджанага тыпу дэменцыі, — тлумачыць герантолаг. — Пры своечасова прынятых мерах чалавек у пачатковай стадыі можа знаходзіцца да глыбокай старасці.

Гісторыі дэменцыі падобныя. Як правіла, людзі, а найчасцей гэта блізкія, позна звяртаюцца па медыцынскую дапамогу, заўсёды знаходзячы тлумачэнні таму, што ў пажылога сваяка псуецца характар і назіраюцца змяненні ў паводзінах.

— Сёння пытанні з раннім зваротам да медыкаў не акцэнтаваныя. Людзі не ведаюць, дзе ўзяць інфармацыю, што гэта за праблема і на што звяртаць увагу, — кажа Людміла Жылевіч. — Важна не толькі правільна расстаўляць акцэнты, але і прапаноўваць выйсце.

Нярэдка ў блізкіх няма навыку кантактавання з пажылымі людзьмі, улічваючы асаблівасці іх узросту. І так званы эйджызм у сям'і моцна б'е па псіхіцы пажылых.

— Пажылы ўзрост — узрост слабасці, у тым ліку і ва ўспрыманні, — акцэнтуе ўвагу ўрач. — Пажылыя людзі часам не могуць хутка рэагаваць, а нам нецікавыя іх праблемы. Адна з асаблівасцяў успрымання ў пажылым узросце — растлумачыць такому чалавеку, напрыклад, як карыстацца смартфонам: трэба зрабіць не адзін раз, а дзесяць.

Заўважыць змяненні

Першымі прыкметамі дэменцыі на яе ранняй стадыі з'яўляюцца наступныя. Пажылы чалавек добра памятае, што было шмат гадоў таму, але не можа ўспомніць тое, што адбывалася раніцай гэтага дня. Адчуваюцца складанасці ў камунікацыі: чалавек не можа сфармуляваць, што яму трэба. І складанасці ў арыентацыі: пайшоў у магазін, не знайшоў яго і сцвярджае, што той перанеслі. Каб знайсці магазін ці паліклініку, чалавеку патрэбныя дадатковыя арыенціры: агароджа ці дрэва. А варта перафарбаваць агароджу ці спілаваць дрэва, ён не знойдзе патрэбных устаноў. Характэрная дэзарыентацыя ў часе, з цяжкасцю ўспрымаюцца прастаравыя рэчы: дата, дзень тыдня. Не даецца і лік: такі чалавек не можа палічыць грошы. Часта мяняецца настрой: ад агрэсіі да дэпрэсіі.

На сярэдняй стадыі дэменцыі чалавеку патрэбны догляд: ён не можа знайсці прыбіральню, адзецца, выйсці з дому. Могуць быць і галюцынацыі. На позняй стадыі таксама патрэбная дапамога, асабліва ў сельскай мясцовасці. Пажылыя людзі з дэменцыяй не ведаюць, на якім прыпынку выйсці, губляюцца.

— Лячэнне пачынаецца не з таблетак, а з псіхасацыяльнага ўмяшання, гэта падтрымка сям'і і блізкіх. У 70 % выпадкаў пажылых людзей з дэменцыяй даглядаюць іх дзеці. Важна рабіць тое правільна. Асноўны прынцып — любы пацыент мусіць старэць дома, і якасць яго жыцця мусіць дазваляць пакідаць яго дома. Дэменцыя складае канчатковую частку шляху чалавека як асобы. І гэтага сам чалавек не павінен адчуваць, — рэзюмуе Людміла Жылевіч.

Западозрыць дэпрэсію

Пра самае распаўсюджанае ў пажылым узросце псіхічнае расстройства — дэпрэсію — расказаў **галоўны ўрач Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія» Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ.**

— Не заўсёды пажылы ўзрост азначае, што ў чалавека дрэнна з памяццю, што абавязкова ўзніклі псіхічныя праблемы. Часта паводзінскія змены тлумачацца рэагаваннем на страты, напрыклад, блізкіх людзей, і патрабуюць падтрымкі, — кажа псіхіятр.

Дэпрэсія — самае распаўсюджанае псіхічнае расстройства ў пажылым узросце. Яго важна адрозніваць ад кагнітыўных расстройстваў. І калі чалавек з дэменцыяй мае патрэбу ў падтрымцы, то дэпрэсію неабходна лячыць. Рызыка гэтага расстройства асабліва высокая ў людзей ва ўзросце 60+.

Асноўнымі сімптомамі дэпрэсіі з'яўляюцца штодзённы паніжаны настрой на працягу двух тыдняў, зніжэнне адчування цікавасці ці задавальнення, зніжэнне энергічнасці і павышаная стамляльнасць. Сярод дадатковых сімптомаў — змяншэнне ўпэўненасці і самаацэнкі, пачуццё самаасуджэння ці віны, думкі пра смерць або суіцыд, якія перыядычна паўтараюцца, змяншэнне здольнасці абдумваць і канцэнтравацца, нерашучасць, трывога ці затарможанасць, парушэнні сну любога тыпу, паніжэнне апетыту і зніжэнне вагі на 5 % за месяц, цяжар, сцісканне ці тупыя болі ў вобласці сэрца, сухасць у роце, запоры, сухасць скуры, тахікардыя, ваганні артэрыяльнага ціску.

— Вядома, важна адрозніваць праблемы са сном і звыклы рэжым. Калі чалавек уставаў на работу ў 5 гадзін раніцы 40 гадоў і такі рытм сфарміраваўся, то чакаць, што, выйшаўшы на пенсію, ён будзе спаць да 8-9 раніцы, не варта, — тлумачыць Аляксей Аляксандраў. — Пры гэтым калі чалавек стаміўся і два тыдні не можа выспацца, колькі б ні спаў, гэта дэпрэсія.

Урач звяртае ўвагу, што антыдэпрэсанты — адны з самых бяспечных прэпаратаў у параўнанні з тымі ж антыбіётыкамі, якія мы вельмі часта набываем без прызначэння ўрача і прымаем самастойна. Яны не выклікаюць залежнасці, не ўплываюць на ўжыванне іншых лекаў, не ўзаемадзейнічаюць са спіртным. Пры гэтым важна не кідаць прыём антыдэпрэсантаў, пакуль вам іх не адменіць урач.

З простых спосабаў падаўлення дэпрэсіі і пазбаўлення ад стрэсу ўрач называе ўмераную фізічную нагрузку і пераключэнне ўвагі.

Алена КРАВЕЦ.

Асабісты вопыт

Асабістай гісторыяй дэменцыі ў блізкага чалавека падзялілася псіхолаг Псіхалагічнага цэнтра развіцця для дзяцей і дарослых Таццяна ШАРАНДА:

— З прычыны сваёй прафесіі я добра ведала, што такое дэменцыя. Год таму мой муж трэці раз перахварэў на COVID-19. І нам давялося звярнуцца да ўрача, які і паставіў дыягназ «дэменцыя». І калі ўрач сказаў, што гэтай дэменцыі ўжо пяць гадоў, я была вельмі здзіўлена. Я не хацела прымаць змяненні ў псіхічным здароўі мужа, бо ён чалавек, які 40 гадоў працаваў інжынерам-канструктарам, займаўся спортам, падарожнічаў, цікавіўся музыкай. Выйшаўшы на пенсію, ён працягваў весці актыўны спосаб жыцця. Мне здавалася, што гэтага дастаткова і ўсе яго змяненні я ўспрымала як асаблівасці характару. Псіхалагічны клімат у сям'і быў неспрыяльны — я пастаянна раздражнялася, бо лічыла, што з ім усё ў норме. Муж аддаляўся, закрыўся ў сабе.

Пасля таго як быў устаноўлены дыягназ, я сказала: я за цябе вазьмуся, гэта ж мая спецыялізацыя. І я ператварылася ў маці з гіперапекай. З урачом мы склалі схему, вельмі насычаную, і я пачала дзейнічаць вельмі актыўна. Я лічыла, што будзе дастаткова, калі пачнём працаваць у кірунку развіцця псіхічных функцый. Я кантралявала мужа, рэжым дня быў вельмі жорсткі. Муж за пару месяцаў стаміўся так, як не стамляўся ад маёй абыякавасці за папярэднія гады. План быў разлічаны на паўгода. У выніку праз тры месяцы я заўважыла, што мае чаканні не апраўдваюцца. У мяне самой развілася псіхаэмацыянальнае выгаранне. Я пачала звяртацца да алкаголю. Праўда, удалося своечасова зразумець гэта і спыніцца. Пасля заахвоцілася камп'ютарнымі гульнямі.

Усё гэта, магчыма, працягвалася б і далей, калі б я не знайшла патрэбную дапамогу і спецыялістаў, якія мяне падтрымалі. Пакуль не магу сказаць, што псіхічна я аднавілася на 100 %. У мяне час ад часу ўзнікае агрэсія ў адносінах да мужа, аднак я ведаю, што на яе праяўленні накладзена табу. Разам з тым магу сказаць, што за 40 гадоў свайго жыцця з сужэнцам я не адчувала да яго такіх цёплых пачуццяў, як цяпер. Таму вельмі важна знайсці падтрымку ў любой сітуацыі. Цаніце сябе, сваіх блізкіх і сваё здароўе!

Як западозрыць дэпрэсію? Для гэтага дастаткова адказаць на некалькі простых пытанняў.

1. Ці адчуваеце вы страту энергічнасці?
2. Ці адчуваеце вы страту інтарэсаў?
3. Ці адчуваеце вы страту ўпэўненасці ў сабе?
4. Ці адчуваеце вы ўласную бездапаможнасць?

Калі вы станоўча адказалі хоць бы на адно з пералічаных пытанняў, працягвайце адказваць на наступныя.

5. Ці адчуваеце вы цяжкасці пры канцэнтрацыі ўвагі?
6. Ці ёсць у вас страта вагі (з прычыны дрэннага апетыту)?
7. Ці бываюць у вас раннія абуджэнні?
8. Ці адчуваеце вы затарможанасць?
9. Ці сталі вы горш адчуваць сябе раніцай?

Інавацыі

НОВАЯ ЗБРОЯ СУПРАЦЬ РАКАВЫХ КЛЕТАК

Навукоўцы БДУ распрацавалі прэпарат для фотадынамічнай тэрапіі анкалагічных захворванняў

Дадзеная тэрапія з'яўляецца сучасным метадам барацьбы са злаякаснымі новаўтварэннямі з прымяненнем фотасенсібілізатару. Гэты лекавы сродак уводзіцца ўнутравенна і пад уздзеяннем святла пэўнага спектра спрыяе знішчэнню ракавых клетак. Такім чынам адбываецца кропкавае ўздзеянне на тканкі, што дазваляе пазбегнуць хірургічнага ўмяшання і захаваць цэласнасць органаў.

Перавагай прэпарату БДУ з'яўляецца яго здольнасць пры актывацыі выпраменьвання блізкага да інфрачырвонага дыяпазону, глыбей пранікаць у біялагічныя тканкі. Таксама распрацоўка арыентавана на буйныя пухліны і можа прымяняцца пры злаякасных пухлінах, якія не паддаюцца хірургічнаму лячэнню.

Работа над стварэннем новага прэпарату вядзецца навуковым калектывам фізікаў, хімікаў і біёлагаў БДУ пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі спектраскапіі НДІПФП імя А. М. Сеўчанкі Міхаіла Самцова. Ужо поўнасцю вывучаны фотафізічныя, медыка-біялагічныя і хімічныя ўласцівасці прапанаванага прэпарату. Акрамя таго, для работы з новым фотасенсібілізатарам супрацоўнікі лабараторыі спектраскапіі згаданага інстытута стварылі спецыяльную апаратуру — спектрометр для вызначэння назапашвання фотасенсібілізатару і лазерныя крыніцы для апраменьвання тканак пухлін.

Сёння ў рэалізацыі праекта па стварэнні прэпарату актыўна ўдзельнічае старшы навуковы супрацоўнік НДІПФП імя А. М. Сеўчанкі Дзмітрый Тарасаў. Яго ўклад у распрацоўку адзначаны стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На дадзеным этапе распрацоўка БДУ прайшла даклінічныя даследаванні, плануецца пераход да клінічных выпрабаванняў з перспектывай укаранення ў медыцынскія ўстановы Беларусі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 1 (64)

Біяразнастайнасць

Андрэй ХУДЫК:

«РАЗРАЗАЦЬ БЕЛАВЕЖСКУЮ ПУШЧУ АГАРОДЖАЙ — ЗЛАЧЫНСТВА»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Летась суседнія Літва і Польшча заявілі пра планы будаўніцтва штучных загарод з бетону, жалеза і калючага дроту ўздоўж граніцы з Беларуссю на фоне міграцыйнага крызісу. Літва пачала ўзводзіць такія збудаванні летам 2021 года, а ў студзені 2022-га распачала будаўніцтва і Польшча. Даўжыня агароджы складзе 186 км, вышыня — 5,5 м.

Спецыялісты ўпэўненыя: яна ўжо стала перашкодай для міграцыйных патокаў — а менавіта дзікіх жывёл, і акажа негатыўны ўплыў на стан каштоўных прыродных сістэм на трансгранічных тэрыторыях.

Сярод тэрыторый, якія могуць сур'ёзна пацярпець у выніку будаўніцтва, — аб'ект Сусветнай прыроднай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча», а таксама беларуска-польска-ўкраінскі біясферны рэзерват «Заходняе Палессе» і заказнік «Гродзенская пушча».

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалая СВІДЗІНСКАГА,** высокі міжнародны статус Белавежскай пушчы прадугледжвае ўзаемную адказнасць Беларусі і Польшчы за захаванне пагранічных прыродных комплексаў і экасістэм. І за апошнія трыццаць гадоў было наладжана цеснае ўзаемадзеянне паміж двума бакамі для атрымання і падтрымання такога статусу.

Але будаўніцтва агароджы змяніла сітуацыю. Яно парушае прынцыпы такіх міжнародных дакументаў як Канвенцыя аб біялагічнай разнастайнасці, Канвенцыя ЮНЕСКА аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, Рамсарская канвенцыя, Канвенцыя па захаванні мігруючых відаў дзікіх жывёл, Бернская канвенцыя і іншых.

У Мінпрыроды ўпэўненыя, што будаўніцтва агароджы ўздоўж беларуска-польскай граніцы, у тым ліку на тэрыторыі Белавежскай пушчы і Заходняга Палесся, прынясе шкоду біялагічнай разнастайнасці прыгранічных рэгіёнаў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

— Мы сур'ёзна занепакоеныя такой сітуацыяй, — кажа **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.** — Гэта велізарная шкода прыродзе, і сёння рэзаць такой агароджай аб'ект сусветнай спадчыны, Белавежскую пушчу, фактычна папалам — гэта злачынства.

> Паводле разлікаў вучоных НАН Беларусі, агульная шкода, нанесеная навакольнаму асяроддзю ў выніку будаўніцтва агароджы, складзе не менш за 18 мільёнаў долараў ЗША.

НАСТУПСТВЫ ДЛЯ ФАЎНЫ І ФЛОРЫ

Штучная перашкода парушыць натуральныя шляхі міграцыі, арэалы многіх відаў, у тым ліку чырванакніжных. Гэта пашкодзіць папуляцыі еўрапейскага зубра, які жыве па абодва бакі ад граніцы і дагэтуль меў магчымасць свабодна перамяшчацца па ўсёй Белавежскай пушчы. Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Павел ГЕШТОЎТ,** генетычная разнастайнасць мясцовай папуляцыі зуброў вельмі нізкая. Раздзяленне папуляцыі можа прывесці да яе дэградацыі.

Лот № 1	Барабан галтовочный (855.152) – инв. номер 2794, установка кокильная (л.144.00) – инв. номер 1550, установка кокильная (л.144.00) – инв. номер 1537, установка кокильная (л.144.00) – инв. номер 1787, установка кокильная (л.144.00) – инв. номер 1788, установка кокильная (л.144.00) – инв. номер 1789, установка кокильная (л.144.00) – инв. номер 1790, установка кокильная (л.144.00) – инв. номер 1549, установка кокильная (л.144.00) – инв. номер 1899
Начальная цена с учетом НДС 20 %	**13 176,00 бел. руб.**
Минимальная цена с учетом НДС 20 %	**7 905,60 бел. руб.**
Сумма шага аукциона	**658,80 бел. руб.**

Порядок ознакомления с предметом электронных торгов: осуществляется в рабочие дни с 9.00 по 16.00 – Николай Маркович, 8044-505-16-54

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Электронные торги проводятся в порядке, определенном постановлением Министерства экономики Республики Беларусь от 01.04.2019 № 9 (ред. от 20.05.2021) «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)» (вместе с «Инструкцией о порядке организации и проведения электронных торгов по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)»)

Организатор аукциона имеет право снять предмет электронных торгов с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Срок подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи Покупатель обязан подписать в течение 3 (трех) календарных дней с момента его получения, но не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить **затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору в размере 10 % от цены продажи** предмета электронных торгов в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 09.00 до 16.00 26.05.2022.

Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов. Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.05.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны:
+375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

Извещение о проведении аукциона по продаже пустующего жилого дома в частную собственность в д. Прусовичи, д. 4 Околовского сельисполкома Логойского района Минской области

Форма проведения аукциона	Открытый
Наименование предмета аукциона	Жилой дом
Дата, время и место проведения аукциона	27 мая 2022 года в 14.00, д. Околово, 52, Околовский сельисполком, зал заседаний
Продавец и его адрес, телефоны	Околовский сельский исполнительный комитет, 223119, Минская область, Логойский район, д. Околово, 52, тел.: 1774-51-7- 35; 1774-72-1-58; А1 44 5883006
Местонахождение имущества	Минская область, Логойский район, д. Прусовичи, д. 4
Общая площадь жилых помещений	72,0 кв. м
Жилая площадь	50,0 кв. м
Описание имущества	Одноэтажный, одноквартирный жилой дом, материал стен – бревно, деревянные перекрытия, крыша – шифер, отопление печное. Водопровод, канализация, газоснабжение, электроснабжение – отсутствуют. Пристройка деревянная – 3,0 м – 2,0 м. Сарай дощатый – 5,0 м – 4,0 м
Условия аукциона по продаже пустующих домовладений	Возместить затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, расходы по публикации извещения в средствах массовой информации в соответствии с актом выполненных работ в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона
Начальная цена предмета аукциона, бел. рублей	32,00
Сумма задатка и реквизиты продавца	20 % от начальной (стартовой) цены жилого дома, **6,40 руб.** Получатель – Околовский сельисполком, расчетный счет (IBAN) BY53AKBB36006191211090000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка (BIC) AKBBBY2X, УНП 600181669, ОКПО 04431582, код платежа 04707
Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения (без учета стоимости размещения извещения о проведении аукциона), бел. руб.	Объявление в газету
Адрес земельного участка	Минская область, Логойский район, д. Прусовичи, д. 4
Площадь земельного участка	Не зарегистрирован
Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
Дата начала приема документов	С даты объявления аукциона
Окончательный срок приема документов	20 мая 2022 года до 16.00

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами», с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 сентября 2021 года № 547 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116», на основании решения Минского областного исполнительного комитета от 27 сентября 2021 года № 844 п. 2, на основании решения Околовского сельского исполнительного комитета.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

Для участия в аукционе представляются:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:
- копия платежного поручения о внесении суммы задатка;
- гражданин предъявляет – документ, удостоверяющий личность;
- представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов на участие в аукционе заключается СОГЛАШЕНИЕ о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с Околовским сельским исполнительным комитетом.

Осмотр пустующего дома осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное им время в течение установленного срока приема заявлений.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, **обязан:**

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

- возместить затраты за организацию и проведение аукциона, внести плату за предмет аукциона;
- подать заявление о предоставлении земельного участка.

После принятия соответствующего решения обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и предмета аукциона, а в случае предоставления земельного участка на праве аренды заключить договор аренды земельного участка и обратиться за его государственной регистрацией.

Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 31 мая 2022 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1*	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Ранишняя, 24 (У-255, микрорайон «Барановичи 5,6»), 440100000003004654**	0,0977	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, наружная площадь (площадь застройки): 99 (99) кв. м. Степень готовности: 10 %. Фундамент: блоки фундаментные	358,20	22 497,03 (3 553,00; 18 944,03)	4 400
2*	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Ларисы Ляшенко, 29 (У-393, микрорайон «Заболоть»), 440100000002006969**	0,1001	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, наружная площадь (площадь застройки): 137 (137) кв. м, общая площадь: 135,1 кв. м. Степень готовности: 35 %. Фундамент: блоки железобетонные. Наружные и внутренние стены: блоки газосиликатные. Составные части и принадлежности: подвал (готовность 74 %, площадь 50 кв. м, стены: бл. ж/б, перекрытия – плит. ж/б)	398,81	56 667,27 (28 539,17; 28 128,10)	11 000
3*	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Новодворная, 14 (У-195, микрорайон «Зарица-5»), 440100000003004705**	0,0891	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, наружная площадь (площадь застройки): 149 (149) кв. м. Степень готовности: 4 %. Фундамент: сваи железобетонные	346,75	19 801,55 (1 856,81; 17 944,74)	3 900

** – Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится 31 мая 2022 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 29 апреля по 25 мая 2022 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: **+ 375 (152) 626055, 626056.**

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу РБ http://gki.gov.by/ru/auction-auinf_object/, Гродненского областного исполнительного комитета http://region.grodno.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, ГП «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

МАТЭРЫЯЛІЗАВАНАЯ СУВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

Як жывуць беларускія архівы?

АРХІЎ — гэта памяць гісторыі. І ад тых, хто там працуе, залежыць, наколькі поўна тая памяць захаваецца. Сёлета святкуецца векавы юбілей архіўнай службы на Беларусі. Пра сённяшні яе дзень і гісторыю мы гутарым з дырэктарам Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Віктарам КУРАШАМ.

Фота БелТА.

— Колькі архіваў існуе на Беларусі, якая іх спецыфіка? Што агульнага ў архіваў і музеяў і чым яны адрозніваюцца?

— Колькі ўсяго налічваецца архіваў у нашай краіне, ніхто не зможа вам адказаць, бо архівы ствараюцца ў самых розных арганізацыях і ўстановах; існуюць асабістыя і сямейныя архівы.

Калі ж весці гаворку пра дзяржаўную архіўную галіну Беларусі, то сёння яна ўключае 35 устаноў, сярод якіх 31 дзяржаўны архіў, дзве навукова-даследчыя ўстановы і дзве галіновыя лабараторыі.

Сярод дзяржархіваў шэсць адносяцца да рэспубліканскага, дзевяць — да абласнога і 16 — да занальнага ўзроўняў. Абласныя і занальныя архівы ўтвораны па адміністрацыйна-тэрытарыяльным прынцыпе і захоўваюць дакументы пэўнага рэгіёна. Адзначу, што ў Беларусі таксама дзейнічаюць 122 тэрытарыяльныя архівы.

У сваю чаргу, частка архіваў рэспубліканскага ўзроўню мае «спецыялізацыю» па храналогіі: дакументальныя матэрыялы, створаныя ў перыяд да 1917 года, захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі і ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна (між сабой дзеленыя архівы маюць «размежаванне» па тэрытартыяльным прынцыпе), а створаныя ў перыяд пасля 1917 года — у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Спецыфіка Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі і Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва закладзена ў іх назвах.

Што датычыцца падабенства і адрознення ў дзейнасці архіваў і музеяў... Па-першае, такія ўстановы з'яўляюцца неацэннымі скарбніцамі нацыянальнай памяці. Да гэтага спіса трэба дадаць яшчэ і бібліятэкі. З-за вельмі падобных функцый мяжа паміж дадзенымі сацыяльнымі інстытутамі бывае даволі ўмоўная, у выніку чаго ў фондах музеяў і бібліятэк нярэдка захоўваюцца дакументальныя матэрыялы, а ў фондах архіваў — музейныя прадметы (як я казаў, у рамках галіны нават дзейнічае «архіў-музей»).

Па-другое, калі разважаць пра непасрэднае месца і стаўленне да дакумента, то можна казаць (вядома, у пэўнай ступені спрашчаючы), што ў музейнай экспазіцыі ён прымярае на сябе вобраз экспаната-сімвала эпохі ці асобы, для бібліятэкі ж ён каштоўны як крыніца інфармацыі ці помнік літаратуры, а вось у архіве — у дадатак да вышэйпералічанага — у найбольш поўнай ступені раскрываецца «прырода» дакумента — з яго гісторыяй з'яўлення, існавання і захоўвання, асаблівасцямі афармлення, суправаджальным дакументальным кантэкстам.

Дакументы ўласнага паходжання з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Ну і па-трэцяе, дзяржаўныя архівы, музеі і бібліятэкі Беларусі, маючы агульныя мэты і кірункі дзеяння, актыўна супрацоўнічаюць, кожны год ажыццяўляюць дзясяткі сумесных праектаў, спалучаючы спецыфіку і спецыялізацыю кожнага ўдзельніка, атрымліваецца максімальна поўна адлюстраваць шматграннасць пэўнай гістарычнай падзеі альбо асобы.

— Якія цікавыя праекты рыхтуюцца ў Год гістарычнай памяці?

— Беларускімі архівістамі запланаваны шэраг праектаў — выдавецкіх, экспазіцыйных, інфармацыйна-асветніцкіх, адукацыйных. Некаторыя з іх ужо праведзены альбо рэалізоўваюцца цяпер. Усе зацікаўленыя маюць магчымасць аператыўна сачыць за інфармацыяй на нашым галіновым сайце «Архівы Беларусі», а таксама на сайтах дзяржархіваў і ў іх афіцыйных акаўнтах у сацыяльных сетках.

Калі звярнуцца да лічбаў, то адзначу, што архівы ў Год гістарычнай памяці падрыхтуюць звыш 140 дакументальных выставак. Сярод тэматычных кірункаў — працэсы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці, ключавыя падзеі айчыннай гісторыі, знамянальныя і памятныя даты ў жыцці беларускага народа і дзяржавы, знакавыя юбілеі арганізацый і ўстаноў, вядомых палітычных, ваенных дзеячаў, прадстаўнікоў навукі, культуры Беларусі. Згадаю выставы да 80-годдзя стварэння Беларускага штаба партызанскага руху, 120-годдзя з дня нараджэння Панцеляймона Панамарэнкі, 140-годдзя народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Адзначу, што выставачныя праекты архіваў характарызуюцца не толькі шырокай тэматычнай разнастайнасцю, але і рознымі формамі прадстаўлення (стацыянарныя — на стэндах і вітрынах, мабільныя — на банэрах і планшэтах, электронныя).

Асаблівую ўвагу ў Год гістарычнай памяці архіўная галіна аддае рабоце з моладдзю. Ва ўзаемадзеянні з установамі адукацыі на сістэмным узроўні выбудоўваецца алгарытм па ўключэнні дакументальных матэрыялаў у адукацыйныя і выхаваўчыя працэсы.

Па ініцыятыве дэпартамента са студзеня 2022 года рэалізуецца праект «Архівы — школе», які прадугледжвае рэгулярнае правядзенне архівамі асветніцкіх мерапрыемстваў для навучэнцаў — школьнікаў, студэнтаў, курсантаў. Названыя мерапрыемствы ажыццяўляюцца як на базе архіваў (у форме выстаў, лекцый, практычных заняткаў), так і на базе ўстаноў адукацыі (у форме семінараў, адкрытых урокаў). За першы квартал 2022 года праведзена 130 такіх мерапрыемстваў.

— Калісьці па ініцыятыве архівіста Віталя Скалабана ў Нацыянальным архіве Беларусі з удзелам газеты «СБ. Беларусь сегодня» быў заснаваны Народны архіў, куды любы чалавек мог аддаць свае ўспаміны ці ўспаміны сваякоў, фотаздымкі, дакументы, што датычацца не толькі нейкіх значных грамадскіх падзей і асоб, а проста гісторыі асобнай сям'і... На вашу думку, які дакумент мае права трапіць у архіў і што вы параіце тым, хто хоча захаваць гісторыю свайго роду?

— «Гісторыя сям'і — гісторыя малой радзімы — гісторыя краіны». Простая, але вельмі дакладная формула таго, як мы часцей за ўсё ўсведамляем сваё мінулае. Генеалогія — памяць аб продках — гэта карані і аснова, на якой гісторыя будуецца і на якой засноўваецца яе ўспрыманне.

Сёння спецыялістамі адзначаецца ўздым цікавасці да генеалагічных даследаванняў з боку грамадскасці. Сведчаннем гэтаму з'яўляюцца і высокая запатрабаванасць платных паслуг дзяржархіваў на правядзенне пошуковых работ, і штодзённая самастойная работа дзясяткаў даследчыкаў-аматараў у чытальных залах архіўных устаноў. У тым ліку ўлічваючы гэты інтарэс, Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі рэалізуецца праект па выпуску шматтомнага даведніка «Гербоўнік беларускай шляхты» — на дадзены момант выйшла сем тамоў з матэрыяламі да літары «І» ўключна.

Што датычыцца матэрыялаў асабістага паходжання, то на пастаяннае дзяржаўнае захоўванне могуць быць прыняты розныя дакументы. Гэта неабавязкова павінны быць выключна «сухія» афіцыйныя паперы. Напрыклад, вось такі выпадак: вядомы чалавек быў заўзятым тэатралам — і ў складзе яго асабістага фонду на захоўванне паступіў збор афіш і праграмак 1930—1950 гадоў. Ці ўзяць фотаздымкі: у Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў такія матэрыялы, здараецца, перадаюць цэлымі калекцыямі — як вядомыя фатографы-прафесіяналы, так і аматары.

Безумоўна, архівісты правядзяць экспертызу каштоўнасці падобных дакументаў — даследуюць іх інфармацыйную, навуковую, культурную вартасць.

Толькі за 2020—2021 гады на пастаяннае захоўванне было прынята амаль 27 тысяч дакументаў асабістага паходжання партыйных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікоў навукі і культуры (у тым ліку кампазітара Яўгена Глебава, пісьменнікаў Рыгора Барадуліна і Генадзя Бураўкіна).

— Сёння вядзецца актыўная работа па выяўленні фактаў генацыду беларускага народа... Якія знаходкі ўжо зробленыя і што плануецца? Дзе можна будзе азнаёміцца з вынікамі?

— Сучаснаму пакаленню беларусаў, якое не зведала жахаў вайны, цяжка нават уявіць, праз якія выпрабаванні прайшоў наш народ у 1941—1945 гады і ў пасляваенны перыяд. Сыходзяць ветэраны і відавочцы падзей. Але аб'ектыўная карціна таго часу назаўжды застанецца ў калектыўнай памяці, дзякуючы ў тым ліку архіўным матэрыялам і рабоце дзяржаўных архіўных устаноў краіны.

З моманту пачатку ў красавіку 2021 года крымінальнай справы па факце генацыду насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд беларускімі архівістамі праводзіцца комплексная навукова-даследчая, метадычная і практычная работа па аказанні садзейнічання органам пракуратуры ў рамках расследавання.

Па ўсёй краіне арганізавана работа па выяўленні і прадстаўленні копій архіўных дакументаў, звязаных з фактамі генацыду. Калі закрануць лічбы, то ў 2021 годзе органам пракуратуры было прадстаўлена звыш 168 тысяч старонак копій архіўных дакументаў (на паперовых і электронных носьбітах), за I квартал 2022 года выраблена больш за 20 тысяч старонак копій архіўных дакументаў. Архівісты аказваюць неабходную дапамогу прадстаўнікам пракуратуры ў рабоце з архіўнымі дакументамі і навукова-даведачным апаратам да іх.

Матэрыялы выяўляюцца ў архіўных фондах акупацыйных устаноў, ваенных і паліцэйскіх падраздзяленняў, савецкіх партызанскіх і падпольных фарміраванняў, камісій па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі БССР, органаў улады, арганізацый і ўстаноў рэспублікі, якія адказвалі за вывучэнне падзей Вялікай Айчыннай вайны і ўвекавечанне памяці ахвяр генацыду.

Хачу падкрэсліць, што аператыўна і паспяхова аказваць неабходную дапамогу работнікам пракуратуры беларускім архівістам дапамагае назапашаны вопыт і праведзеная ў папярэднія гады вялікая работа па вывучэнні і абнародаванні архіўных дакументаў аб нацысцкіх злачынствах.

За мінулую чвэрць стагоддзя дзяржаўныя архівы выдалі больш за 50 зборнікаў дакументаў і даведнікаў, падрыхтавалі звыш 150 дакументальных выставак, прысвечаных розным пытанням беларускай гісторыі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Архівісты Беларусі аднымі з першых на постсавецкай прасторы ў спецыяльных археаграфічных выданнях звярнуліся да такіх тэм, звязаных з нацысцкай акупацыяй, як «вогненныя вёскі», карныя аперацыі, Халакост, лагеры савецкіх ваеннапалонных, вывяз мірнага насельніцтва на прымусовую працу.

Не мае аналагаў база даных «Беларускія вёскі, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны», падрыхтаваная айчыннымі архівістамі і размешчаная ў адкрытым доступе. У яе аснову пакладзены дакументальна пацверджаныя факты знішчэння нацыстамі населеных пунктаў на беларускай зямлі ў 1941—1944 гадах. Па стане на сённяшні дзень у базе змяшчаецца інфармацыя аб 9097 вёсках, знішчаных поўнасцю і часткова, з насельніцтвам і без. Выяўленне звестак аб спаленых вёсках працягваецца.

Інфармацыя аб архіўных знаходках па малавядомых аспектах і так званых белых плям гісторыі рэгулярна публікуецца на галіновым сайце «Архівы Беларусі», на інтэрнэт-партале Міністэрства юстыцыі, у часопісах «Архівы і справаводства», «Юстыцыя Беларусі», у іншых сродках масавай інфармацыі. Работнікі архіваў выступаюць на радыё і тэлебачанні. Па тэме нацысцкага генацыду падрыхтаваны шэраг дакументальных выставак рэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўню.

Сёлета будзе завершана рэалізацыя фундаментальнага выдавецкага архіўнага праекта «Без тэрміну даўнасці». У адпаведнасці з канцэпцыяй дадзенай серыі, кожнай вобласці краіны (у сучасных адміністрацыйна-тэрытарыяльных границах) прысвячаецца асобны том. На гэты час выдадзены зборнікі па Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях. Рыхтуюцца тамы аб злачынствах нацыстаў на тэрыторыі Брэсцкай і Мінскай абласцей. Зборнікі складаюцца з двух раздзелаў: у першым публікуюцца дакументы аб злачынствах нацыстаў на акупаванай тэрыторыі, у другім — дакументы аб устанаўленні і расследаванні дадзеных фактаў.

Усяго ў зборніках серыі будзе апублікавана больш за тысячу дакументальных сведчанняў злачынстваў нацыстаў. Прэзентацыі выданняў праходзяць у абласных цэнтрах з удзелам вучоных-гісторыкаў. Пасля выдання заключнага тома зборнікі ў электронным выглядзе будуць размешчаны ў адкрытым доступе на сайце «Архівы Беларусі».

Падрыхтавала
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Поўны тэкст інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by.

КАНЦЭРТ У ВОДСВЕЦЕ ЗАЛПАЎ

Гераічныя старонкі гісторыі беларускай філармоніі

25 красавіка 1937 года, 85 гадоў таму, афіцыйна адкрылася Беларуская дзяржаўная філармонія. Напачатку ў ёй налічвалася чатыры калектывы: сімфанічны аркестр, аркестр беларускіх народных інструментаў, Беларускі ансамбль народнай песні і танца і Беларуская харавая капэла.
Ад тых часоў у гісторыі філармоніі здарылася багата розных падзей... Давайце адновім некаторыя старонкі з дапамогай дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

РУХОМЫ «КУСТ»

Вось падклееная, абарваная па краях выразка з газеты «Советское искусство». Нават назва заметкі «На передовых позициях» трохі пашкоджаная.

«Под артиллерийским обстрелом и пулеметным огнем врага, по проселочным дорогам, искалеченным воронками фугасных бомб, шесть недель движется пятнистая трехтонка, замаскированная ветвями молодых берез. Лишь вблизи внимательный глаз бойца опознает в этом движущемся кусте агитмашину белорусских актеров».

Дата падкажа шмат: 11 верасня 1941 года.

Вось яшчэ адна заметка — з газеты «Советская Белоруссия» ад 6 ліпеня 1941 года — «Выступление артистов на фронте».

«Белорусская государственная филармония по поручению ЦК КП(б)Б организовала бригаду артистов для художественного обслуживания частей действующей Красной Армии. В состав бригады входят: заслуженный артист республики Бергер, артисты Гомельского областного драматического театра Перстин, Чернов, артист музкомедии Сайков и другие.

3 июля бригада впервые выступила с концертом в Н-ской части. Бойцы тепло встретили выступление артистов.

В ближайшие дни такие же концерты будут организованы и в других частях действующей армии».

Вось такая, гераічная, старонка гісторыі Беларускай філармоніі... Каб удакладніць, як гэта было, звернемся да ўспамінаў Сяргея Астраумава «Особое подразделение».

Малады артыст Астраумаў рыхтаваўся пачаць творчы шлях на сцэне гомельскага драматычнага тэатра... Планы перакрэсліла вайна.

«Дальнейшие события, сыгравшие немаловажную роль в судьбе многих из нас, связаны с приездом в Гомель из Минска Григория Павловича Прагина. ЦК КП(б) Белоруссии поручил ему, директору Белорусской государственной филармонии, работу по организации эстрадно-театральных бригад для художественного обслуживания частей действующей Красной Армии.

...В углу театрального, где стоял единственный чахлый каштан, с бурыми от пыли листьями, актеры строили бомбоубежище: углубляли и расширяли наспех вырытую траншею. Тут же, во дворе, началась, как выразился Прагин, «мобилизация» актеров в Первую фронтовую бригаду».

Артысты апынуліся адусюль, і гомельскія, і тыя, хто аднекуль эвакуіраваўся... «В составе бригады также оказались заслуженный артист БССР Михаил Бергер и тенор-студент консерватории Юрий Матраев».

ФІЛАРМОНІЯ ПЛЮС КАНСЕРВАТОРЫЯ

Гэтыя два прозвішчы — Прагін і Бергер — будуць сустракацца ў гісторыі франтавой канцэртнай брыгады часта... Мы ўжо ведаем, што арганізатарам выступіў Прагін. Лагічна, што да гэтай працы далучылі, паралельна з дырэктарам філармоніі, і дырэктара кансерваторыі Міхаіла Бергера. У адзін дзень, 28 чэрвеня 1941 года, праз тыдзень пасля пачатку вайны, яны атрымалі аднолькавыя пасведчанні:

«Центральный комитет коммунистической партии (большевиков) Белоруссии.
№ 447 28/VI-1941г.
Удостоверение
Центральный комитет КП(б) Белоруссии поручает тов. Бергеру работу по организации эстрадно-театральных бригад для художественного обслуживания частей действующей Красной Армии».

Дакладна такое ж пасведчанне меў Прагін. Так што засталося выканаць указ: *«асноўным заняткам філармоніі бліжэйшага перыяду лічыць стварэнне канцэртнай брыгады для абслугоўвання Чырвонай Арміі. Мастацкім кіраўніком прызначыць заслужанага артыста БССР М. Бергера. Ускласці на яго абавязкі канцэртмайстра».*

Наступны дакумент, на палове аркушыка вучнёўскага сшытка ў лінейку, — пасведчанне аб тым, што члену канцэртнай брыгады па абслугоўванні воінскіх часцей дзеючай арміі тав. Бергеру М. А. выдадзены браўнінг № 278377.

Вернемся да заметкі пра шасцідзясяты канцэрт брыгады.

«Радостны встречи с доблестными защитниками родины. Трехтонка становится эстрадой, кругом амфитеатром располагаются зрители. Так было у танков, еще не остывших после боя, у самолетов, готовых каждую минуту взлететь в воздух, у партизан, вернувшихся из рейда по тылам врага, у зенитчиков, артиллеристов и саперов... Сигнал воздушной тревоги обрывает песню. Вынужденный перерыв артисты проводят в убежище. Навстречу фашистским стервятникам поднимаются советские самолеты. Короткий воздушный бой, и в дверях убежища появляется улыбающийся лейтенант. Он говорит:

— Простите за беспокойство, противник отброшен.

...Концерт продолжается».

Пад зацемкай — подпісы аўтараў: «Г. Прагин, С. Остроумов».

Дарэчы, менавіта Бергер падчас гэтага канцэрта іграў на піяніна, якое ўстанавілі проста на грузавіку. Сяргей Астраумаў згадвае: *«Бергер участвовал в самых трудных поездках бригады, в том числе — в части комкора Л.Г. Петровского, сражавшейся за Рогачов и Жлобин. Михаил Аркадьевич носил в кармане пистолет «ТТ», тщательно обернутый в носовой платок».*

Даведка ад 15.08.1941 года пад штампам Беларускай дзяржаўнай эстрады сведчыць, што тав. Бергер *«с 1.07.41 работая по обслуживанию концертами — действующей Красной Армии в качестве пианиста и художественного руководителя в связи с окончанием работы направляется в город Новосибирск».*

Подпіс — дырэктар У. Прагін.

Справа ў тым, што вораг імкліва набліжаўся да Гомеля, і 19 жніўня 1941 года кіраўніцтва эвакуіравала Першую франтавую брыгаду ў Тамбоў.

ТАЛЕНТЫ Ў САЛОМЕ

Хутка беларускіх артыстаў направілі ў Дом Чырвонай Арміі Заходняга фронту.

Артыстам давялося нялёгка. Дом Чырвонай Арміі ўвесь час перадыслацыраваўся, даводзілася вандраваць, галадаць, начаваць, дзе прыйдзецца... Тым больш не ўсе камандзіры разумелі, нашто ў такія напружаныя баявыя дні ваддацца з нейкімі артыстамі.

А тыя давалі па некалькі канцэртаў на дзень.

«К утру печь остывает. За окном серый промозглый рассвет. Актеры спят, поглубже зарывшись в свои соломенные ложа.

— Подъем! — вдруг кричит молодецким голосом вошедший в комнату Прагин.

Актеры прекрасно слышат команду, но остаются неподвижными. Тогда Григорий Павлович сдергивает с лежащих укрывающие их одежки...

Так и живем. Умываемся во дворе ранним утренним снежком, дежурный приносит в ведрах довольствие с полевой кухни соседей-зенитчиков, приносит бегом, чтобы пища не успела остыть.... Пока мы едим, Григорий Павлович делает замечания по вчерашним концертам.

— Безобразие, — говорит он Патюкову, выколачивая в ладонь свою неизменную трубочку. — Начинаете концерт с «медленного фокстрота». Белорусская бригада и вдруг шут знает что!

Пока Григорий Павлович говорит, Макс умудряется, внимательно глядя на него, стучать по чем попало ксилофонными палочками, Миша Перстин записывает в дневник бригады количество данных за день концертов. Иногда пишет «два с половиной», «три с половиной»... «Половина» означает, что фриц помешал закончить программу.»

Дарэчы, канцэрты пачыналі з песні на словы, напісаныя паэтам Паўлам Фурманскім:

«Мы явиться в гости рады
На рубеж передовой,
Белорусская бригада —
Ваш товарищ фронтовой.

Чтоб дойти к родному дому,
Чтоб врага отбросить прочь,
Без затей, по-боевому,
Рады песней вам помочь».

«СПРАВЯДЛІВА СПЯВАЮЦЬ»

Давайце бліжэй пазнаёмімся з Рыгорам Паўлавічам, або насамрэч Гіршам Літманавічам Прагіным... Ён нарадзіўся ў 1903 годзе ў Мсціславе, дзе бацька рамантаваў музычныя інструменты. У 16 гадоў патрапіў у Чырвоную Армію, біў басмачоў. Да творчай кар'еры прыйшла вучоба ў Мінскім музычным тэхнікуме. Рыгор Шырма ўспамінаў, што сустрэў Прагіна ў вясне 1939 года, пасля вызвалення Заходняй Беларусі:

«У гэты час я ўпершыню пазнаёміўся з Рыгорам Паўлавічам Прагіным, які быў і заснавальнікам беларускай філармоніі і яе першым дырэктарам на працягу многіх гадоў.

Цудоўныя якасці ў характары Р. П. Прагіна як адміністратара і чалавека былі здзіўляючыя: ён умела падбіраў мастацкіх кіраўнікоў творчых калектываў філармоніі, з якімі было ў яго поўнае ўзаемаразуменне ў вырашэнні творчых пытанняў. Таму і калектывы былі дасканала афармлены і ўкамплектаваны выдатнымі кадрамі...

Прыгадваю адзін канцэрт. Хор выступае на сцэне Дома афіцэраў у Бабруйску. Непадалёк ад сцэны ў перапоўненай зале сядзеў стары сівабароды чалавек. Узрушана і ўважліва слухаў. У час паўзы Прагін падышоў і спытаў:

— Ну, як спяваюць?

— Справядліва спяваюць, — адказаў стары.

Для Рыгора Паўлавіча такая арыгінальная ацэнка была ўзнагародай не меншай, чым асалода старога слухача ад песень».

Жонка Рыгора Прагіна — вядомая спявачка, народная артыстка БССР Сафія Друкер. Яна таксама ўдзельнічала ў рабоце франтавых канцэртных брыгад. У сямейнай пары былі свае рахункі з фашыстамі. Іх дваіх дзяцей не паспелі эвакуяваць з Мінска. А пасля малыя апынуліся ў гета. Знаёмыя казалі, што спрабавалі ім дапамагчы, бо тыя ледзь не прасілі міласціну на вуліцах...

Дзеці Прагіна і Друкер загінулі ў гета. Расказваюць, што калі сямейная пара музыкантаў вярнулася ў Мінск, асаблівым здзекам выглядала, што іх кватэра засталася цэлай... Нават рэчы на месцах. А дзяцей няма...

Нядзіўна, што Рыгор Прагін стаў не проста артыстам-агітатарам, а байцом танкавай брыгады. Ваяваў у танкавым корпусе генерала Бурдзейнага. Як ён піша ў сваёй аўтабіяграфіі, *«в сентябре 1943 года в боях за г. Ельно был контужен, и после излечения я был назначен старшим инструктором политотдела 2-го гвардейского Тацинского танкового корпуса. Этот корпус 3-го июля 1944 года первый ворвался в столицу белорусской республики — Минск и изгнал немецко-фашистских захватчиков. За участие в боях по освобождению г. Минска я был награжден орденом Отечественной войны II степени».*

Канцэрт у партызан. Спявае С. Друкер. 1944 г.

БАЯВЫ МАЛЯР

У фондзе Рыгора Прагіна захоўваецца стос паперак — даведак пра выступленні франтавой канцэртнай брыгады. Часам гэта простая афіцыйная даведка:

«Справка
Коллективом бел. гос. филармонии в N-ском авиабатальоне 2.8.41 дан концерт»

Часам даведка ператвараецца ў цёплы водгук:

«Справка.

Выдана настоящая коллективу Белорусской филармонии в том, что им дан концерт для ранбольных школы №7 гор. Тамбова 13.9.41. Концерт прошел с высоким мастерством и искусством. Все присутствующие на концерте высоко оценили выступление коллектива, выразив от глубины сердца благодарность всему коллективу. Выступление мобилизовало бойцов и командиров на скорейшее выздоровление и возвращение в строй для окончательного разгрома злейшего врага человечества — фашизма, а медсостав для лучшего обслуживания ранбольных.

Военком ст. политрук Ивановский».

А вось цікавая цыдулка на кавалку аркуша з вучнёўскага сшытка:

«т. конферансье

Интересно будите ли вы исполнять скеч который вы исполняете с маляром

5.08.41 Павлов»

Відавочна, гэтая цудам захаваная цыдулка напісана гледачом падчас аднаго з канцэртаў...

Што ж гэта за «скеч с маляром»? Давайце звернемся да ўспамінаў Сяргея Астраумава:

«Зоя Овчарова читает рассказ Владимира Полянова «Кокетка Лиза», а потом вместе с Женей Полосиным играет под непрерывный смех зрителей скетч «Маляр» — сценку, сохранившуюся в нашей программе до самого конца войны. Вообще на фронте оказались очень нужными все эти «Маляры», «Ревнивцы», «Укушенные», «Счастливые отцы», «Минуточки» — веселые, озорные скетчи, шутки и репризы.

— Очень нужное дело делаете, — благодарил нас военком после концерта. — Отдохнули хлопцы. Отличная зарядка!»

З рэпрызай «Маляр» звязаны цікавы эпізод... Было гэта ў Падольску. Зал клуба запоўнены цалкам, паспяхова адыгрываюцца нумары...

«Наконец дошла очередь до «Маляра». Женя Полоскин вышел на сцену с кистью и ведром, перемазанный от кепки до тапочек разными «колерами». И вдруг — страшный грохот. Гаснет свет, сыплются выбитые стекла и штукатурка. Все мгновенно устремляются к дверям. И в это время, перекрывая шум, раздается истошный, умоляющий крик Жени Полоскина:

— Подождите... Я расскажу, что дальше было.

Мгновенное замешательство — и властный голос командира:

— Всем оставаться на своих местах!

А дальше? Дальше — общий смех. Карманные фонарики освещают сцену.

Выбираясь из темноты здания, Чернов жаловался на шум в ушах: он слетел с подоконника, когда во дворе клуба взорвалась фугаска. Но Прагин слушал Петра невнимательно: отругал Ваню Патюткова, который во время своего выступления сыграл «Попурри из блюзов».

